ЗАЎТРА ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА

ТВОЙ ГОЛАС ВАЖНЫ ДЛЯ БЕЛАРУСІ!

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

10 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. СУБОТА № 195 (28053) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АДКАЗНАЯ РЭАЛІЗАЦЫЯ ПРАВІЛЬНАГА РАШЭННЯ

Будаўніцтва Беларускай АЭС вядзецца ў адпаведнасці са строгім рэгламентам захавання якасці

Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка наведаў пляцоўку будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі. Кіраўнік дзяржавы пабываў на вытворчай базе будаўніцтва БелАЭС, дзе азнаёміўся з тэхналогіяй вырабу спецыяльных металаканструкцый, цыркуляцыйных вадаводаў і трубаправодаў. Затым Прэзідэнт пераехаў на пляцоўку будаўніцтва рэактара блока №1 Беларускай АЭС. Аляксандру Лукашэнку далажылі аб завяршальным этапе падрыхтоўчых работ і ходзе будаўніцтва БелАЭС, а таксама аб рэалізацыі праекта па выдачы электрычнай магутнасці ад будучай атамнай электрастанцыі, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Як адзначыў віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка, працы па будаўніцтве Беларускай АЭС вядуцца строга па графіку.

Аляксандр Лукашэнка цікавіўся пытаннямі бяспекі. Ён звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што пры ўзвядзенні Беларускай АЭС ні ў якім выпадку не варта спяшацца. Прэзідэнта запэўнілі, што пры ўсіх работах выконваецца чатыры этапы кантролю. Уладзімір Сямашка падкрэсліў, што будаўніцтва вядзецца ў адпаведнасці са строгім рэгламентам адпаведнасці якасці.

Кіраўнік дзяржавы наведаў вучэбна-трэніровачны цэнтр Беларускай АЭС. Прэзідэнту далажылі таксама аб тым, як развіваецца неабходная жыллёвая і сацыяльная інфраструктура для будаўнікоў і работнікаў БелАЭС.

Размаўляючы з калектывам БелАЭС і жыхарамі Астравецкага раёна, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ўласная АЭС — гэта зусім іншае аблічча беларускай нацыі.

Сёння, на думку кіраўніка дзяржавы, няма сумненняў, што ў Беларусі паступілі правільна, пачаўшы будаўніцтва ўласнай атамнай электрастанцыі. «У нас павінна быць станцыя, гэта танная электраэнергія, новыя тэхналогіі», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў Беларусі яшчэ захаваўся так званы постчарнобыльскі сіндром, калі з аварыяй на ЧАЭС звязваюць, напрыклад, рост анкалагічных захворванняў. «Каб больш эфектыўна працаваць у гэтым кірунку, а мы тут не адстаём ад вядучых краін, мы ўвесь час падцягваем сваю медыцынскую галіну», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. У прыватнасці, на днях у Беларусі адкрыўся пазітронна-эмісійны цэнтр у РНПЦ анкалогіі, які забяспечвае раннюю дыягностыку анкалагічных захворванняў.

Прэзідэнт адказаў на пытанні ўдзельнікаў сустрэчы, у тым ліку аб тым, ці магчыма стварэнне прэферэнцыі пры працаўладкаванні для членаў сем'яў замежных спецыялістаў, якія прыехалі будаваць атамную электрастанцыю. Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, гэтыя людзі — «ужо не замежнікі». Ён паабяцаў, што калі замежныя спецыялісты, якія працуюць на АЭС, унясуць прапановы па гэтым пытанні праз свайго кіраўніка, то па ўсіх пытаннях будзе прынята рашэнне.

Прэзідэнт не абышоў увагай і атрыманне пісьменніцай Святланай Алексіевіч Нобелеўскай прэміі па літаратуры. (Як паведамляла раней прэс-служба кіраўніка дзяржавы, Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Святлану Алексіевіч з высокай узнагародай.) «Я рады за яе, таму што гэта грамадзянка Беларусі, гэта сведчыць пра тое, што, якую б ты пазіцыю ні займаў, усё ж такі ў Беларусі магчыма працаваць і ствараць, пісаць, выказваць свой пункт гледжання, пазіцыю і гэтак далей», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што не лічыць Святлану Алексіевіч апазіцыянерам. «Гэта добра, што чалавек мае сваю пазіцыю, можа, недзе і апазіцыйную, — сказаў ён. — Яна напісала нармальныя творы, у яе адпаведны стыль». «Гэта яе форма, яе стыль. Я нічога супраць не маю». Аляксандр Лукашэнка лічыць важным, што першы беларус пасля савецкіх часоў стаў лаўрэатам Нобелеўскай прэміі ў літаратуры. «Галоўнае цяпер — як ты распарадзішся гэтым багажом. Калі ты грамадзянка Беларусі, гэта твая зямля, твая дзяржава, пададзеца табе ці не, але ты ўжо сёння чалавек, які падняўся высока, паглядзім, як жа ты гэты імідж, гэты багаж, які ў цябе з'явіўся, выкарыстаеш на карысць свайго народа», — цытуе БЕЛТА беларускага лідара.

Учора адбылася таксама сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з генеральным дырэктарам дзяржаўнай карпарацыі па атамнай энергіі «Расатам» Сяргеем Кірыенкам.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі будуецца самая бяспечная і сучасная АЭС у свеце. «І мы дамаўляліся, што пабудуем найлепшую станцыю. І будзем яе будаваць, як прыклад іншым, на высокім узроўні», — сказаў беларускі лідар.

Сяргей Кірыенка, у сваю чаргу, пацвердзіў, што Беларуская АЭС будзе самая бяспечная, у першую чаргу, і самая сучасная атамная станцыя пакалення 3+. «Аналагаў гэтай станцыі пакуль у свеце няма, гэта самая сучасная, самая бяспечная, — сказаў ён. — Абсалютны прыярытэт аддаецца бяспецы, якасці».

Сяргей Кірыенка таксама адзначыў добрую працу беларускіх падрадных арганізацый.

СЯМЕЙНА-СВЯТОЧНЫ НАСТРОЙ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У сталічны Лошыцкі парк мінчане на выхадныя любяць прыходзіць усёй сям'ёй.

ЦЫТАТА ДНЯ

Марына АРЦЁМЕНКА, намеснік начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:

«У Беларусі каля 3 тысяч мужчын знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў. Пераважна ў «маміным» водпуску знаходзяцца таты малых, але ёсць і дзядулі. Так, у 2012 годзе ў ім знаходзіліся 3 тыс. 598 мужчын, у 2013-м — 2 тыс. 836, у 2014-м — 2 тыс. 745. Сярод асноўных прычын сыходу мужчын у «дэкрэт» — асабістыя (здароўе, сямейныя абставіны і г.д.) і фінансавыя. Згодна з Працоўным кодэксам Рэспублікі Беларусь, водпуск па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў можа прадастаўляцца не толькі жанчыне, але і працуючаму бацьку або іншым сваякам дзіцяці, якія фактычна ажыццяўляюць догляд, з выплатай штомесячнай дапамогі. Дарэчы, бацькоўскі водпуск прадугледжаны заканадаўствам 78 краін».

■ Выбары-2015

940 ЖУРНАЛІСТАЎ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ У ІНФАРМАЦЫЙНЫМ ЦЭНТРЫ ЦВК

542 замежныя журналісты, 398 беларускіх акрэдытаваліся для асвятлення выбарчай кампаніі ў нашай краіне 11-12 кастрычніка. Пра гэта паведаміла Лілія Ананіч, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь, на брыфінгу, прысвечаным працы інфармацыйнага цэнтра Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Журналісты ў нашу краіну прыязджаюць з 30 дзяржаў свету. Усяго ж — і беларускіх, і замежных — акрэдытацыю для працы ў інфармацыйным цэнтры атрымалі 940 супрацоўнікаў СМІ.

— У інфармацыйным цэнтры створаны ўсе ўмовы для таго, каб журналісты маглі паўнавартасна, камфортна і якасна працаваць, — заявіла міністр інфармацыі.

Па словах Ліліі Ананіч, работа СМІ ўжо прыносіць вынікі.

— Мы бачым, што грамадзяне актыўна ідуць на выбарчыя ўчасткі, — заўважыла яна. — Упэўнена, што 11 кастрычніка ў нашай краіне будзе і свята, і выбары, беларускі народ годна выбера сваю будучыню, свайго прэзідэнта.

АД ЧАГО ЗАЛЕЖЫЦЬ ХУТКАСЦЬ ПАДЛІКУ?

Вечарам 11 кастрычніка самай запатрабаванай будзе інфармацыя пра тое, хто ж набраў максімальную колькасць галасоў. Як заўважыла Лідзія Ярмошына, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, хуткасць падліку галасоў залежыць ад тых людзей, якія працуюць у выбарчых камісіях.

«Я думаю, што сёлета падлічыць галасы будзе прасцей таму, што менш кандыдатаў, — лічыць старшыня ЦВК. — Іх не 10, не па дзесяці стосах трэба раскладваць бюлетэні, а па чатырох. У нас усё робіцца ўручную, таму хуткасць залежыць ад навыкаў членаў выбарчых камісій. Хутка падлічыць можа толькі машына. Толькі электроннае галасаванне дае магчымасць падлічыць галасы ў межах адной хвіліны пасля закрыцця выбарчага ўчастка.

ЭЛЕКТРОННАЕ ГАЛАСАВАННЕ — НЕАНАНІМНАЕ

На гэта звярнула ўвагу Лідзія Ярмошына, адказваючы на пытанне пра магчымасць у будучыні электроннага галасавання і такога ж падліку галасоў. Варыянт «прыйшоў на выбары, паставіў на спецыяльным маніторы (як пры атрыманні пасведчання кіроўцы) подпіс, а камп'ютарная праграма палічыла б усё вельмі хутка, або прасцей за тое — дома праз інтэрнэт прагаласаваў» хоць і просты, але мае шмат хібаў.

«Як мы тады будзем выконваць адзін з галоўных прынцыпаў выбараў — тайнае галасаванне? — задалася пытаннем Лідзія Ярмошына. — Бо галасаванне, калі камп'ютар тут жа адзначае волевыяўленне, дазваляе пракантраляваць голас кожнага выбаршчыка. Такім чынам магчыма паўплываць на гэты голас, а потым, можа, і расправіцца з гэтым выбаршчыкам, калі яго волевыяўленне не задаволіць тых, хто арганізуе галасаванне. Таму, вядома, такі спосаб не падыходзіць».

Старшыня ЦВК таксама звярнула ўвагу на той факт, што ў любую электронную сістэму можна запусціць вірус. «Альбо, калі нават адбудзецца звычайная паломка або аварыя на электрастанцыі, галасы выбаршчыкаў могуць быць знішчаны, — зазначыла яна. — І ў гэтым таксама ёсць пэўная праблема. Дадам, што гэта вельмі дарагая тэхніка, і яна імгненна маральна старэе. Я не ведаю, ці трэба Рэспубліцы Беларусь набываць гэтае абсталяванне; акрамя вялікіх грошай, яно патрабуе і вялікай колькасці спецыяльна навучанага персаналу, а затым яшчэ яго трэба захоўваць да наступных выбараў. А да наступных выбараў яно, магчыма, ужо састарэе. Ці трэба гэта? Няўжо ў нас ёсць лішнія грошы?»

Што тычыцца галасавання праз інтэрнэт, то, заўважыла Лідзія Ярмошына, «усе эксперыменты на гэты конт, якія праведзены разумнымі амерыканцамі, паказалі: падобнае хатняе галасаванне не стымулюе выбаршчыкаў удзельнічаць у выбарах наогул». «Знаходзячыся дома, яны забываюць прагаласаваць нават па інтэрнэце, — адзначыла старшыня ЦВК. — У той час, як наведваючы выбарчы ўчастак, яны ўдзельнічаюць у дэмакратычных працэдурах. Таму, я думаю, што тая дэмакратычная працэдура, якая ў нас існуе, спрыяе аб'яднанню грамадства і выхаванню ў яго пэўных дэмакратычных традыцый. І я не думаю, што ад яе трэба адмаўляцца».

У той жа час Лідзія Ярмошына лічыць, што галасаванне праз інтэрнэт «лагічна і апраўдана», і яго «трэба абавязкова ўжываць як дадатковую форму галасавання, напрыклад, для грамадзян, якія знаходзяцца за мяжой або знаходзяцца ў дзень выбараў па-за межамі асноўнага месца жыхарства».

ЗА ТРЫ ДНІ ПРАГАЛАСАВАЛА АМАЛЬ 20%

У краіне ідзе датэрміновае галасаванне. На 9 раніцы 9 кастрычніка ў Брэсцкай вобласці прагаласавала 17,3% выбаршчыкаў, у Віцебскай — 19,99%, у Гомельскай — 19,19%, у Гродзенскай — 19,48%, у Мінскай — 19,21%, у Магілёўскай — 19,53%, у Мінску — 17,03%. За межамі краіны прагаласавала 22,38% выбаршчыкаў. У сярэднім па краіне прагаласавала 18,7% грамадзян, што валодаюць выбарчым правам.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЗША размесцяць у Польшчы пяць ваенных баз

Польшча і ЗША падпісалі пагадненне, якое вызначае размяшчэнне складоў амерыканскай цяжкай ваеннай тэхнікі на тэрыторыі Польшчы, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на «Радыё Польшча». Польскі бок прадаставіў да выкарыстання тэрыторыю і аб'екты, якія належаць авіяцыйнай базе ў Ласке, Цэнтру навучання сухапутных войскаў у Драўска-Паморскім, ваенным комплексах у Сквежыне, Цеханаве і Хошчна. «Пагадненне дае амерыканскаму боку магчымасць ствараць базы тэхнікі ў Польшчы і тым самым узмацняць саюзніцкую прысутнасць і павялічваць узровень бяспекі ў Польшчы і рэгіёне», — паведамляе Міністэрства абароны Польшчы. Акрамя дзяржаў Прыбалтыкі і Польшчы, у спісе краін, дзе можа быць размешчана ваенная тэхніка з ЗША, фігуравалі Балгарыя, Румынія, Эстонія і Венгрыя. Вашынгтон плануе размясціць у названых дзяржавах каля 1,2 тысячы адзінак бранятэхнікі, уключаючы 250 танкаў, а таксама БМП M2 Bradley і артылерыйскія сістэмы.

Кітай запускае ўласную міжнародную аплатную сістэму

Першая чарга Кітайскай міжнароднай аплатнай сістэмы China International Payment System (CIPS) сёння афіцыйна ўведзена ў эксплуатацыю ў Шанхаі. Гэтая сістэма, якую распрацаваў і ўкараняе Народны банк Кітая, дазволіць замежным удзельнікам рынку праводзіць разлікі і клірынг у юанях з кітайскімі калегамі напрамую з 9.00 да 20.00 па пекінскім часе ў любы працоўны дзень. Першая транзакцыя ў юанях праз новую сістэму была праведзена з Кітая ў Люксембург, на адрас шведскай кампаніі IKEA, гаворыцца ў паведамленні кітайскага Цэнтрабанка. Кітай у апошнія гады паскарае тэмпы інтэрнацыяналізацыі юаня. Паводле інфармацыі Таварыства сусветных міжбанкаўскіх фінансавых тэлекамунікацый, кітайскі юань ужо стаў пятай аплатнай валютай у свеце, абагнаўшы канадскі і аўстралійскі долары.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Бежанцаў пазбавяць «права на другі крок» унутры ЕС

Еўракамісар па гуманітарнай дапамозе і ўрэгуляванні крызісных сітуацый Хрыстас Стыліянідас заявіў, што ўцекачы будуць размяшчацца ў краінах Еўрасаюза строга згодна з ухваленай схемай і не змогуць перабірацца з адной дзяржавы ў іншую. «У бежанцаў не будзе права на другі крок унутры Еўрапейскага саюза», — сказаў ён. Раней паведамлялася, што ЕС створыць пры агенцтве па кантролі знешніх межаў офіс па рэпатрыяцыі нелегальных мігрантаў, якія прыбылі ў краіны Еўрасаюза. Кіраўнікі МУС краін Еўрасаюза прынялі рашэнне аб размеркаванні 120 тыс. бежанцаў па краінах ЕС у рамках квот для кожнай з краін. Адзначаецца, што сотні тысяч мігрантаў, якім было адмоўлена ў атрыманні прыстанішча, будуць дэпартаваны з Еўрапейскага саюза.

КАРАТКА

VIII Беларускі міжнародны стаматалагічны кангрэс пройдзе ў Мінску 21-23 кастрычніка з удзелам вядучых вучоных замежных краін, у тым ліку з Германіі, Францыі, Іспаніі, Ізраіля.

Колькасць беспрацоўных за верасень бягучага года ў Беларусі зменшылася на 2,2 тыс. чалавек. Зніжэнне назіраецца з ліпеня гэтага года (на 1 ліпеня беспрацоўных налічвалася 46,8 тыс. чалавек, на 1 жніўня — 46,6 тыс. чалавек, на 1 верасня — 45,9 тыс. чалавек, на 1 кастрычніка — 43,7 тыс.).

Амаль 80% жылых дамоў у Беларусі падключаны да ацяплення.

У Мінску падбіраюць памяшканні для стварэння сеткі беларускага бістро. Канцэпцыя гэтай ідэі прадугледжвае арганізацыю сучасных аб'ектаў з разнастайным асартыментам страў, прыгатаваных па-дамашняму смачна з выкарыстаннем натуральнай сыравіны.

Беларус Максім Мудрэўскі стаў чэмпіёнам Еўропы па цяжкай атлетыцы сярод моладзі да 23 гадоў у вагавой катэгорыі да 85 кг.

Рашэннем Мінскага гарвыканкама выдзелена 450 кватэр сацыяльнага карыстання асобным катэгорыям грамадзян, у тым ліку сіротам, сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, шматдзетным сем'ям.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.10.2015 г.

Долар ЗША	17202,00	▼
Еўра	19446,00	▼
Рас. руб.	279,85	▲
Укр. грыўня	794,73	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 7°
Віцебск	+ 3°
Гомель	+ 4°
Гродна	+ 6°
Магілёў	+ 4°
Мінск	+ 4°

ДАВЕДАЦЦА ЗАГАДЗЯ

На выхадзе з участка ў вас могуць спытаць, за каго вы прагаласавалі

У дзень выбараў апытанне грамадзян на выхадзе з выбарчых участкаў — экзітполы — будуць праводзіць тры арганізацыі. Гэта Інстытут сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, маладзёжная лабараторыя сацыялагічных даследаванняў рэспубліканскага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый», а таксама Інстытут параўнальных сацыяльных даследаванняў «Еўразійскі барометр». Спецыяльна для «Звязды» Давід РОТМАН, дырэктар Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар сацыялагічных навук, прафесар, расказаў, у якіх выпадках вынікі экзітпола максімальна дакладныя і ці можна ім давяраць.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

— Калі не было памылак пры распрацоўцы выбаркі, тады звесткі экзітполаў атрымаюцца максімальна блізкімі да афіцыйных вынікаў, — гаворыць Давід Генрыхавіч. — Такія апытанні ў першую чаргу дапамагаюць высветліць тэндэнцыю галасавання, напрыклад за каго аддадзена большасць галасоў, а за каго меншасць. Часам папярэднія звесткі выкарыстоўваюць для праверкі вынікаў падліку галасоў ЦВК.

«Да памылак адносяцца сітуацыі, калі менеш чым 2 чалавекі праводзяць інтэрв'ю, а таксама размовы не па анкеце. Заўвагі назіральнікаў могуць ператварыцца ў небяспечныя заявы аб тым, што інфармацыя экзітпола недакладная.»

Па словах дырэктара цэнтра, у любым выпадку галоўны чыннік для працы экзітполаў — непарушнае прытрымліванне правілаў. «Спачатку разлічваецца, на колькіх участках будуць праводзіцца апытанні. Умоўна кажучы, у Беларусі каля 6600 месцаў для галасавання. Разлічваем па формуле і высвятляем, што нам трэба наведаць, напрыклад, 303 з іх. Яны выбіраюцца па ўсёй тэрыторыі Беларусі прапарцыянальна колькасці насельніцтва і ўчасткаў у рэгіёне, — паведаміў Давід Ротман. — Умоўна, у Мінску 60 участкаў. Усе яны выпісваюцца ў слупок, а пасля выпадковым чынам выбіраюцца». Для таго, каб звесткі былі набліжаны да рэчаіснасці, за дзень неабходна апытаць не менш за 10 000 чалавек. «У 2010-м мы праінтэрв'юіравалі каля 12 тысяч», — дадаў ён.

На кожным участку, дзе праводзіцца экзітпол, працуюць тры чалавекі — два інтэрв'юеры і адзін кіраўнік. «У кожнага з іх павінны быць бэйджы з пазнакай, якую фірму яны прадстаўляюць, а таксама пасведчанне з пячаткай і подпісам», — патлумачыў дырэктар ЦСПД. Па яго словах, каманды павінны знаходзіцца на ўчастку ад 8 гадзін раніцы і да 8 гадзін вечара, нягледзячы на надвор'е і любыя іншыя абставіны. «Адзін спыняе выбаршчыка і задае яму некалькі пытанняў, якія прапісаныя ў анкеце, і адзначае адказы. Пасля апошняга адказу другі інтэрв'юер не спыняе любога наступнага, а пачынае адлічваць так званы крок адбору. Ён разлічваецца загадзя асобна для кожнага ўчастка. Напрыклад, апытаецца кожны 5-ты, 10-ты ці 15-ты. На ўчастках у густанаселеных мікрараёнах, накшталт Каменнай Горкі ў Мінску, гэта можа быць і кожны 20-ты, — распавядае Давід Генрыхавіч. — Калі не прытрымлівацца гэтага кроку, тады губляецца адзін з элементаў выпадковасці адбору. Першы — па рэгіёнах, другі — па участках і трэці — гэты. Пры ўмове, што вытрымана тая лічба, пра якую згадвалася раней (10 тысяч чалавек), спрацоўваюць законы верагоднасці і атрымліваецца супадзенне з рэальным вынікам, як і ў любым іншым сацыялагічным даследаванні».

Інтэрв'юераў часцей за ўсё выбіраюць са студэнтаў рэгіянальных універсітэтаў. Вопытныя супрацоўнікі экзітполаў вучаць іх правільна праводзіць апытанні, а пасля раздаюць неабходныя дакументы. «У старэйшага з групы, акрамя бэйджа, спецыяльнага пасведчання і пашпарта, павінен быць ліст, падпісаны старшынёй ЦВК, адрасаваны ўсім старшыням участковых камісій. Пасля дазволу ад апошняга група мае права праводзіць апытанне толькі па-за памяшканнем для галасавання. Таму што стоячы ў ім можна заблытацца, хто ўвайшоў, а хто выйшаў. Таму яны выходзяць у двор, адлічваюць ад ганка 30-40 крокаў і спыняюцца. Калі раптам на адным участку сустрэліся 2 экзітполы, яны дамаўляюцца, каб разысціся на 20 крокаў адзін ад аднаго», — гаворыць Давід Ротман.

— Усе трое павінны знаходзіцца ў дварэ ўчастка, — працягвае ён. — Пры неабходнасці адысці можа толькі адзін. Яны таксама не маюць права з кімсьці размаўляць і адказваць на пытанні. У крайнім выпадку кіраўнік можа сказаць: «Прабачце, давайце адыдзем убок і пагутарым». Бывае, падыходзяць людзі, задаюць пытанне, а пасля абвінавачваюць групу ў агітацыі за пэўнага кандыдата. А гэта ўжо скандал.

Пасля 8 гадзін раніцы група аператараў (чалавек 25-30), якія знаходзяцца ў галаўным памяшканні, робяць першы абзвон кіраўнікоў — праверка сувязі. Затым кожныя 2-3 гадзіны тэлефануюць сваім патранатам, збіраюць адказы, якія зафіксавалі групы, падсумоўваюць усе атрыманыя лічбы і фарміруюць агульны зрэз. І так да 19.30, калі робіцца апошні зрэз-тэлефанаванне, і да 20.15 становяцца вядомымі папярэднія вынікі галасавання.

Акрамя ўсяго, падчас кампаніі з іншых краін запрашаюцца высокапрафесійныя назіральнікі не выбараў, а менавіта экзітпола. «Гэта паважаныя прафесары з Еўропы. На гэты раз у нас будзе 4-5 чалавек з Іспаніі, Германіі, Швейцарыі і Вялікабрытаніі. Іх запрасіла фірма, якая праводзіць апытанне. Яны самі выбіраюць, на які ўчастак паехаць, каб не было і думкі, што на іх ідзе нейкі ціск. Назіральнікі не падыходзяць да груп, а глядзяць за імі збоку. У іх ёсць інфармацыя, які на гэтым участку павінен быць крок адбору, і яны падлічваюць яго. Калі ёсць парушэнне — тут жа адзначаюць. Да памылак адносяцца сітуацыі, калі менеш чым 2 чалавекі праводзяць інтэрв'ю, а таксама размовы не па анкеце. Заўвагі назіральнікаў могуць ператварыцца ў небяспечныя заявы аб тым, што інфармацыя экзітпола недакладная», — гаворыць дырэктар цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў.

На пытанне «Ці можна адмовіцца адказваць прадстаўнікам экзітполаў?» Давід Генрыхавіч адзначае: «Так, безумоўна. Існуе спецыяльны ліст адмовы, у ім запісваецца, колькі людзей не дало згоды адказаць. Але калі чалавек адмовіўся, то ўсё адно адлічваецца той жа крок адбору. Значыць, мы апытваем не наступнага чалавека, а праз 5 ці 10, як і патрабуюць разлікі».

У 20.00 закрываюцца выбарчыя ўчасткі, і амаль праз 15 хвілін экзітполы абвесцяць папярэднія звесткі. Давід Ротман упэўнівае ў іх верагоднай слушнасці: «Па сваім досведзе магу сказаць, што часцей за ўсё яны супадаюць з тымі, што абвяшчае ЦВК».

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ДЫСКУСІЯ НА СТАРОНКАХ

Часопіс «Беларуская думка» прэзентаваў спецыяльны выпуск, прысвечаны палітычнаму і эканамічнаму развіццю Беларусі. Пад яго вокладкай сабралі розных жанру і формы матэрыялы, але ўсе яны заклікаюць да аднаго — ацаніць, прааналізаваць тое, як працуе беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця.

— Калі чалавек прымае пэўнае рашэнне, ён павінен ацаніць тое, што ў яго ёсць, і зразумець, што б яму хацелася мець надалей. Гэты нумар — спроба ацаніць тое, чаго мы дасягнулі за апошнія 20 гадоў, — гаворыць **Дзмітрый ЖУК, генеральны дырэктар БелТА**. — У ім сабраныя думкі вельмі вядомых і аўтарытэтных людзей. І кожны ў пэўнай ступені спрабуе прааналізаваць, як мы сёння жывём. Каб адэкватна ацаніць тое, што маем, і зрабіць слушны выбар, куды нам ісці далей.

Адзін з галоўных матэрыялаў нумара — інтэрв'ю з **Андрэем БЕЛЯКОВЫМ, першым сакратаром ЦК БРСМ**. «Паколькі гэты год — Год моладзі і ў той жа час асаблівай палітычнай адказнасці — выбараў, для нас асабліва важна правесці аналіз таго, як мы ажыццяўляем маладзёжную палітыку, дзе памыляемся, дзе робім поспехі, для таго, каб і надалей будаваць незалежную, моцную Беларусь», — сказаў ён, выступаючы падчас прэзентацыі. Па словах **Вадзіма ГІГІНА, галоўнага рэдактара «Беларускай думкі»**, у часопісе ёсць спецыяльная рубрыка, прысвечаная развагам моладзі аб перспектывах развіцця краіны. Яна адна з самых неадназначных і часта выклікае шырокае абмеркаванне сярод чытачоў.

І яшчэ адна «разынка» выпуску — матэрыял **Анатоля РУБІНАВА, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і вядомага грамадскага, палітычнага дзеяча**. Падчас прэс-канферэнцыі ён вусна распавёў пра асноўныя думкі, якія выклаў у сваім артыкуле. «Заўсёды не пагаджаюся з тым, калі кажуць, што кіраўнік дзяржавы — гэта менеджар, маўляў, мы вас нанялі, майце ласку абслугоўваць нас... Але не так развіваецца цывілізацыя. Цывілізацыя развіваецца лідарамі, элітамі. Усюды і заўсёды. Асобы — гэта слупы, якія вызначаюць этапы развіцця. Прычым па ўсіх напрамках: у галіне культуры, навукі, тэхнікі і гэтак далей. А ўжо кіраўнікі дзяржаў, ад якіх залежаць лёсы людзей і развіццё краіны, — гэта асаблівая тэма», — сказаў ён.

«Трэба падвесці вынікі, асэнсаваць: можа, былі нейкія памылкі. Вось гэтыя разважанні я і пастараўся выказаць. Гэта мая асабістая пазіцыя», — падкрэсліў Анатоль Рубінаў. Ён дадаў, што не трэба любымі спосабамі падтрымліваць уладу і даказваць яе правату, а неабходна разважаць аб'ектыўна. Акрамя таго, Анатоль Рубінаў падкрэсліў, што за час свайго існавання часопіс «Беларуская думка» прайшоў вялікую эвалюцыю. Пры гэтым у ім публікаваліся дастаткова разнастайныя матэрыялы: ад літаратурных тэкстаў да навуковых артыкулаў.

«У апошнія гады, мне здаецца, часопіс знайшоў свой твар, выйшаў на пэўную дарогу. Гэта вельмі змястоўны часопіс, цікавы, у ім публікуюцца самавітыя аўтары. У ім няма фармальных і лозунгавых артыкулаў», — падсумаваў акадэмік.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

■ Асабістае

ЛЁС І ДЛЯ СЯБЕ, І ДЛЯ КРАІНЫ

Для мяне сёлетнія прэзідэнцкія выбары першыя. Тыя, што адбываліся ў 2010 годзе, амаль не памятаю. Тады я вучылася ў 11-м класе, і ў думках было адно толькі паступленне. Напэўна, гэта да лепшага. Наўрад ці ў той момант я б змагла зрабіць асэнсаваны выбар. А цяпер і варыянтаў няма: працуючы ў аддзеле палітыкі рэспубліканскай газеты, хочаш не хочаш, а будзеш ведаць пра ўсіх кандыдатаў і пра ўсе «фішкі» кампаніі.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Мяне шчыра здзівіла, што самае дыскусійнае пытанне сёлетняй выбарчай кампаніі, калі меркаваць па СМІ і інтэрнэце, — ісці галасаваць ці не. Не кандыдатура вылучэнца, не дзеянні апазіцыі, а менавіта гэтая тэма выклікала інфармацыйнае цунамі, якое ўсё ніяк не з'едзе на нішто. З пунктам гледжання дзяржаўным і кандыдатаў у прэзідэнты ўсё зразумела. А вось погляды палітычнай альтэрнатывы падзялілася. Далёка не ўсе прыхільнікі апазіцыі лічаць байкот дзейсным.

Члены Аб'яднанай грамадзянскай партыі яшчэ ў сярэдзіне верасня выступілі з афіцыйнай заявай, што ўдзельнічаць у выбарах не будуць. І тым самым далі штуршок для палемікі, якая разгарнулася ў сродках масавай інфармацыі рознага кшталту. І сказаць, што гэта ідэя адшукала шмат адназначных прыхільнікаў, нельга.

З нагоды заявы партыі адзін з вядомых калумністаў прааналізаваў працу амерыканскага даследчыка Мэцью Фрэнкеля, які вывучае, да чаго прыводзіць байкатаванне выбараў. Аказваецца, што толькі ў 4 выпадках са 100 апазіцыя перамагае і прыходзіць да ўлады. У астатніх людзі перастаюць давяраць апазіцыі і яна губляе ўвесь напрацаваны аўтарытэт. Увогуле даследчык прыходзіць да высновы, што такую тэхналогію змены ўлады нельга назваць эфектыўнай, бо тыя 4% поспеху — хутчэй выпадковы збег абставін.

А гэта фраза на адным апазіцыйным рэсурсе вартая цытавання: «Ці магчыма прыйсці да ўлады праз ігнор?». Яе аўтар выступае як прыхільнік аднаго з кандыдатаў у прэзідэнты, які, на яго думку, уяўляе сабой будучую ўладу з чалавечым тварам. І такая пазіцыя прымальная, бо аргументавана пунктамі праграмы кандыдата ў Прэзідэнты і аўтарскім бачаннем наступнага развіцця краіны.

Наступнае пытанне: за каго ўсё ж такі галасаваць? Я чула не ад адной маёй сяброўкі-аднагодкі, што ёй падабаецца пэўны кандыдат з-за знешнасці ці ўмення трымацца перад камерай і на людзях. На пытанне «Ці чытала праграму таго кандыдата?» у лепшым выпадку дзяўчына сціпла апускае вочы са словамі: «Я глядзела выступ на тэлебачанні». Няўжо так робіцца адказны выбар? А як наконт таго, каб зразумець, якімі сродкамі будуць дасягацца гучныя абяцанні «бясплатнай адукацыі», напрыклад? Зірніце ў праграму і адшукайце, адкуль возьмуцца мільёны долараў для гэтага. Ці ўвогуле прапісана гэта?

Для нас, маладых, яшчэ вось якая аналогія прыходзіць на розум. Свайго чалавека, з якім марыш стварыць сям'ю, мы выбіраем сабе не толькі па знешнасці, манерах і гожых словах. Хутчэй, шукаем чалавека адказнага і надзейнага, на якога можна абаперціся. Тут выбар аднолькавы па значнасці і толькі адрозны па сваёй маштабнасці. У любым выпадку — лёсавызначальны.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■ Акцыя

«МЫ РАЗАМ» СПЯВАЕМ ЛЮБІМЫЯ ПЕСНІ

Сёння ў сталічным Палацы спорту прайшоў фінальны канцэрт агульнанацыянальнай акцыі «Мы разам», якую сёлета арганізавалі тэлеканал АНТ і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з мясцовымі органамі ўлады. У ім узялі ўдзел такія артысты, як Аляксандр Ціхановіч і Ядзвіга Паплаўская, Алена Ланская, Дарыя, Аляксандр Грос, Тэа, Іскуі Абалян, ансамблі «Песняры», «Сябры» і многія іншыя.

Як адзначыў **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ**, «мерапрыемствы кшталту рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Мы — разам!» аб'ядноўваюць наш народ. Яны ўжо сталі традыцыйнымі. Такія канцэрты збіраюць людзей не проста добра праводзіць час, але і распавядаць пра дасягненні краіны». На яго думку, канцэрт прайшоў у важны час — час, калі краіна робіць выбар сваёй будучыні. А выбарчая кампанія заўсёды праходзіла на пад'ёме, як свята. І менавіта такія мерапрыемствы дапамагаюць не толькі аб'яднаць людзей, але і паказаць, што сёння ў Беларусі з'яўляецца гонарам. Удзел у такіх акцыях дае адчуванне, што беларусы разам і падтрымліваюць адно аднаго.

Варта адзначыць, што музычны марафон «Мы разам!» праходзіў ва ўсіх абласцях Беларусі. У акцыі прынялі ўдзел больш за 400 артыстаў. З выступленнямі «зорны дэсант» пабываў у Баранавічах, Віцебску, Гродне, Магілёве, Гомелі і шэрагу іншых беларускіх гарадоў. Канцэрты прайшлі з аншлагамі і нагадвалі па сваёй атмасферы сустрэчу сяброў, публіка мела магчымасць спяваць разам з любімымі артыстамі. Падчас канцэртаў транслiраваліся тэксты песень, якія ўжо сталі хітамі для многіх пакаленняў. Не абышлося без гучных апладысментаў, кветак і фатаграфавання на памяць з «зоркамі» беларускай эстрады.

— Для мяне вельмі важна прымаць удзел у такіх акцыях, бо там, дзе аб'ядноўваюцца людзі, ёсць сіла. І самае галоўнае, што мы разам і падтрымліваем адно аднаго, — заўважыла ў адным з інтэрв'ю заслужаная артыстка Беларусі Алена Ланская.

Падтрымала гэтую думку і калега па сцэне спявачка Ядзвіга Паплаўская, якая падчас канцэрта ў Гродне выказала наступную думку: «Мы ездзім з гастролямі па ўсім свеце, і паўсюль пра Беларусь кажуць як пра светлы край. І ў першую чаргу гэта так, дзякуючы людзям, якія жывуць на гэтай зямлі. Дзякуючы таму, што мы разам».

Яркае шоу тэлеканала АНТ ужо некалькі месяцаў гастралюе па Беларусі і завершыцца гала-канцэртам, які гледачы змогуць убачыць сёння вечарам у 21.05 у эфіры тэлеканала.

Алена ДРАПКО.
drapko@zviazda.by

■ Беларусь і свет

СЁННЯ МАЛА ЛІДАРАЎ, ЯКІЯ НАЗЫВАЮЦЬ ТОЕ, ШТО АДБЫВАЕЦЦА Ў СВЕЦЕ, СВАІМІ ІМЁНАМІ

Прамовы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра ЛУКАШЭНКІ на 70-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН атрымалі шырокі рэзананс і ў нашай краіне, і за яе межамі. Праблемы глабальнай цывілізацыі, яе балючыя кропкі кіраўнік нашай дзяржавы назваў сваімі імёнамі. Ці гатова сусветная супольнасць да вырашэння гэтых праблем, што трэба зрабіць на глабальным узроўні? Аб гэтым гутарка з кіраўніком аналітычнага цэнтра ЕсооМ, членам Савета аналітычнай асацыяцыі АДКБ Сяргеем МУСІЕНКАМ.

— Выступаючы ў агульнай дыскусіі 70-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заклікаў сусветных лідараў пакончыць з войнамі і канфліктамі на планеце. Як вы лічыце, наколькі ўвогуле магчыма дамовіцца паміж сабой тым, хто сапраўды хоча міру, і тым, на жаль, уплывовым сёння сілам, што пры дапамозе кіраванага хаосу ўпарта штурхаюць нашу планету да вялікай вайны?

— Дамовіцца з імі вельмі складана. Дакладней, практычна немагчыма, таму што ў іх ёсць свае эгаістычныя інтарэсы, якія супярэчаць самым надзённым спадзяванням велізарнай большасці чалавецтва. І гэтыя інтарэсы яны мэтанакіравана, нахабна і цынічна прасоўваюць ужо не адну сотню гадоў. Інтарэсы гэтыя заключаюцца ў тым, каб ператварыць увесь свет у сваю вотчыну, у якой яны змогуць не толькі распараджацца ўсімі рэсурсамі, але і вяршыць усякі суд самаўпраўна, не аглядаючыся ні на якія законы.

Між тым, гэтыя, як вы кажаце, уплывовыя сёння сілы, на шчасце, не ўсёмагутныя. І тое, што сёння расійская авіяцыя пачала наносіць удары па ІД — гэта адна з падстаў думаць, што ўсё ж такі дамовіцца можна. Як? На мове сілы. Прычым не пагражаючы. Таму што самі яны, гэтыя ўплывовыя сілы, разумеюць толькі мову сілы. А атрымліваецца сёння так, што практычна двухгадовыя невыразныя спробы «сусветнай супольнасці», а дакладней пэўных заходніх краін, якія далучыліся да ЗША, «разабрацца» з ІД, церпяць скрышальную няўдачу. Ну як, скажыце, можна перамагчы ІД, з аднаго боку фактычна скідаючы ім зброю і прадукты (якія ім перадаюць праціўнікі законнага ўрада Сірыі, што падтрымліваюцца Захадам), а з іншага боку кажучы, што нейкія там беспілотнікі бамбяць нейкія незразумелыя аб'екты?

Іншая справа — калі ў рэальную барацьбу з ІД уступіла Расія, якая бескампрамісна ўвайшла ў гэтую сітуацыю па просьбе законна выбранага прэзідэнта Сірыі і пачала наносіць удары па цалкам канкрэтных, старанна разведаных цэлях — складах, штабах кіравання, цяжкай ваеннай тэхніцы, чаго не было раней у краін натаўскай кааліцыі. І тут, вядома, вельмі важна, каб гэтыя ўдары наносіліся вельмі выверана, дакладна. І Расійская Федэрацыя ў першую чаргу зацікаўлена, каб ніякіх памылак не было. Гэтаму спрыяюць і сірыйская разведка, і іранская. Дарэчы, у створаны для барацьбы з тэрарыстамі аналітычны цэнтр у Багдадзе запрашалі і прадстаўнікоў ЗША, але тыя адмовіліся. З якой прычыны? Можа, не вельмі хочацца пазнаваць сярод байцоў ІД тых, каго самі старанна інструктавалі для вайны з Асадам?

Цяпер ЗША вінавацяць Расію ў тым, што яна бамбіць даччыную структуру ІД, заснаваную спецыяльна для ўдзелу ў сірыйскіх баях — «Джабхат ан-нусру», ёй камандуе Абу Мухамад аль-Джаулані. ЗША кажуць, што цяпер, бачыце, паміж матчынай і даччынай структурамі ўзніклі трэнні, і іх бамбіць не трэба(?!). У свой час вырашыць сітуацыю паспрабаваў нават лідар «Аль-Каіды» Айман Завахіры, бо і першыя, і другія дзейнічалі, як яго філіялы. У выніку яго пасланца забілі, а ІД абвясціла сябе халіфатам, непадсудным для любых трацейскіх судоў. Мая думка — дарэмна ЗША лезуць у гэты д'ябальскі «кактэйль»: завязаны намёртва з іх жа падачы вузел невырашальных праблем, звязаны з ІД, сёння можна толькі рассячы!

Вось яшчэ прыклад — наконт іх гатоўнасці дамаўляцца. Не так даўно Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка запрасіў ЗША да «нармандскага» працэсу: чаму ўсе ездзяць да вас па параду, лётаюць туды-сюды цераз акіян, ваш дзяржсакратар прылятае ў Кіеў — а чаму вам самім не сесці за стол перагаворaў з усімі зацікаўленымі бакамі, у чым праблема? Калі мы кажам, што хочам міру, то давайце выкарыстоўваць любую магчымасць. Але гэта працягнутая рука — і нашага беларускага лідара, і Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна — гэта рука добрай волі, падтрыманая, дарэчы, і астатнімі лідарамі Нармандскай чацвёркі, чамусьці «павісла ў паветры».

Прычым — ніякага адказу ўвогуле. Яно і нядзіўна: пагадзіцца не жадаюць, а адмовіць — значыць, на ўвесь свет прадэманстраваць сваю «міралюбнасць».

— Слухаючы выступленні прэзідэнтаў Беларусі і Расіі, якія прагучалі з трыбуны 70-й сесіі Генасамблеі ААН, нельга не заўважыць, што яны не толькі вельмі моцна пераклікаюцца паміж сабой у галоўных момантах, але і шмат у чым нібыта дапаўняюць адно аднаго. Прытым што кожнае з выступленняў нашых лідараў носіць цалкам арыгінальны і, што некалькі нестандартна ў рамках ААН, жывы, дыскусійны характар. Што гэта — даніна пэўнай палітычнай модзе або шчырая спроба дастукацца да сусветнай супольнасці, жаданне данесці да яе ўсю сур'ёзнасць цяперашніх глабальных праблем і пагроз?

— Я не сказаў бы, што гэта даніна модзе. Сёння на планеце мала такіх лідараў, якія, як Аляксандр Лукашэнка, называюць тое, што адбываецца ў свеце, сваімі імёнамі, не азіраючыся ні на каго. Бо наш Прэзідэнт падсправаздачны толькі свайму народу, які напрамую ўручыў яму найвышэйшую ўладу ў дзяржаве. А самае галоўнае — такія лідары могуць выразна данесці да людзей сваю пазіцыю і адказаць на любыя пытанні. Таму што такім, як ён, утойваць няма чаго. І такая адкрытасць нашага лідара, зразумела, многім на Захадзе не падабаецца. Бо віноўнікі тых страшных канфліктаў, якія сёння адбываюцца ў свеце, вядомы, і ён назваў іх адкрыта і сумленна. Паверце, многія кіраўнікі дзяржаў і хацелі б гэта сказаць, але не могуць з цэлага шэрагу прычын — часцей за ўсё таму, што заакіянскі «гаспадар» не зразумее.

Дарэчы, я, хутчэй, сказаў бы пра крыху іншую палітычную моду. Сёння ўжо выгадавана нейкая парода еўрабюракрата, еўрачыноўніка, якога ў маладым узросце вывозяць са сваёй краіны ў ЗША, навучаюць і выхоўваюць у амерыканскіх ВНУ, затым ён праходзіць нейкую першапачатковую падрыхтоўку ў амерыканскім дзяржаўным апараце, потым вяртаецца і становіцца вялікім чыноўнікам, а то і прэзідэнтам або прэм'ерам сваёй краіны. Толькі ўжо — ці сваёй? Скажыце пасля гэтага, чые інтарэсы ён будзе адстойваць? І калі такія людзі сядзяць галасуюць у Еўрапарламенце, трэба разумець, што яны будуць галасаваць згодна з тым свістком або іншым умоўным сігналам, які атрымаюць «адтуль».

— Упэўнены, што пераважная большасць беларусаў падзяляе словы Аляксандра Лукашэнкі, якія прагучалі на 70-й сесіі Генасамблеі ААН, пра тое, што анархіі, бязмежжу і гвалту ніколі не будзе месца на беларускай зямлі — ні пад якімі лозунгамі. І дваццаць гадоў міру і стабільнасці ў Беларусі — лепшае таму пацвярджэнне. Але, з іншага боку, цалкам зразумелую трывогу ў нас, мірных беларусаў, выклікаюць тыя бясконцыя войны і канфлікты, якія бушуюць на нашай планеце, якія мы пастаянна назіраем па тэлебачанні і ў інтэрнэце. У гэтай сувязі, Сяргей Рыгоравіч, пытанне вам як аднаму з вядучых аналітыкаў АДКБ: наколькі надзейна сёння, па-вашаму, забяспечана наша знешняя калектыўная бяспека? І ці варта тут самазаспакойвацца?

— Наша краіна перажыла, асабліва за апошнія сто гадоў, сапраўдную чараду войнаў, у апошняй і самай страшнай з якіх загінуў кожны трэці. Прычым да такіх, суадносных па стратах, катаклізмаў, можна аднесці не толькі Першую і Другую сусветныя войны і грамадзянскую вайну, але і чарнобыльскую катастрофу, наступствы якой Беларусь ліквідуе ўсе гэтыя гады практычна ў адзіночку. І чарада гэтых страшных бедстваў навучыла нас паводзіць сябе па-іншаму. Да бяспекі мы проста гістарычна ставімся больш сур'ёзна, чым многія нашы краіны-суседзі. Успомніце ў савецкі час — аўтарытэт чалавека ў пагонах тут, у Беларусі, заўсёды быў высокі.

І з першых гадоў нашай незалежнасці Прэзідэнтам краіны пытанням абароны заўсёды надавалася асаблівая ўвага. Як бы цяжка ні было спачатку, беларуская армія атрымлівала ўсё неабходнае, пастаянна пераўзбройвалася і мадэрнізавалася. А калі наладзіліся справы ў эканоміцы, наша абаронае будаўніцтва атрымала настолькі сур'ёзнае забеспячэнне, што сёння самі незалежныя замежныя ваенныя эксперты лічаць нашу армію адной з самых баяздольных у Еўропе — дай Бог, вядома, гэтую баяздольнасць ніколі не дэманстраваць. І як бы хто ні казаў — «Навошта гэта трэба?» — мы ўбачылі на прыкладзе многіх краін, як гэта бывае «не трэба». Таму тыя, хто, можа, і хацеў бы праверыць нашу боегатоўнасць, цудоўна ведаюць, што атрымаюць годны адпор, які шматкроць перавышае той, што яны атрымлівалі ў краінах, якія разбурылі.

Сёння бяспека Беларусі, лічу, забяспечана дастаткова надзейна — з аднаго боку, дзякуючы найвысокаму ваенна-тэхнічнаму патэнцыялу сваіх невялікіх, можна сказаць кампактных, але высокаэфектыўных Узброеных Сіл, іх прафесіяналізму і моцнаму маральнаму духу, а з іншага — дзякуючы трываламу абарончаму саюзу з брацкай Расіяй. І тое, што ў Расійскай Федэрацыі ў апошняе дзесяцігоддзе пытанням абароны надаецца, нарэшце, належная ўвага, не можа не ўсяляць аптымізм. Успомнім, як было гадоў 15-20 таму: не трэба было з'яўляцца аналітыкам, каб разумець, чым, у выпадку чаго, небяспечны быў не толькі для Расіі, але і для Беларусі той развал расійскай арміі, які, скажам адкрыта, спыніў Уладзімір Пуцін з прыходам Сяргея Шайгу на пост міністра абароны РФ.

Зрэшты, самазаспакойвацца ўсё роўна не варта. Бо цяперашні ўзровень нашай нацыянальнай бяспекі не прыйшоў да нас сам сабой, ён стаў вынікам цяжкай працы на працягу ўсіх гадоў нашай незалежнасці. І сёння, лічу, цалкам правільна Беларусь актыўна ўдзельнічае і ў сумесных саюзных вучэннях, і ў мерапрыемствах АДКБ, а ў перспектыве будзе ўдзельнічаць і ў ШАС. Гэта дазваляе нам, акрамя адпрацоўкі навыкаў абыходжання з самай сучаснай тэхнікай, перайманць і самы сучасны досвед па барацьбе з тэрарызмам і іншымі пагрозамі.

Ведаеце, а наш жа беларускі лідар усе гады свайго прэзідэнцтва гаварыў пра тое, што Беларусь павінна быць перш за ўсё мірнай і спакойнай краінай. І ўспомніце, колькі за гэтыя гады было ўсмешак такіх, ухмылачак: маўляў, ды пра што тут гаварыць, чым тут выхваляцца? А вось цяпер мы раптам зразумелі, што мір — гэта і ёсць галоўная каштоўнасць, якая вышэй і за так званую свабоду слова, і нават за матэрыяльны дабрабыт. Таму што калі цябе бамбяць, і ўвогуле незразумела, што адбываецца вакол цябе і тваёй сям'і, то пра якія там бытавыя рэчы можа ісці гаворка — хапае табе чагосьці ці не?! І вось на фоне гэтага нашага цяперашняга разумення ўсе тыя інсінуацыі не тое што смешныя, — яны здаюцца нейкім блюзнерствам. Таму што нічога важнейшага за мір для чалавека быць не можа.

Гутарыў Андрэй БАБОК

Печать СТ «Татьяна» (УНП № 600212045) **считать недействительной**
(на основании Протокола №5 заседания правления садоводческого товарищества «Татьяна» от 15.08.2015 г. и Решения Суда Партизанского района г. Минска от 09.09.2015 г.)

В соответствии со ст. 56 ГК РБ частное торгово-производственное унитарное предприятие «РЕФОН» уведомляет о реорганизации в форме преобразования в ООО «РЕФОН».
Требования кредиторов удовлетворяются в порядке и сроки, предусмотренные ст. 23 Закона РБ «О хозяйственных обществах», по адресу: 220014, г. Минск, ул. Попова, д. 15.
Контактное лицо – Бережная Владислава Александровна. УНП 191579436

Жыві і квітней, Беларусь!



БЕЛТА.

УЧОРА, СЁННЯ, ЗАЎТРА

ПАДСТАВЫ ДЛЯ РЫЎКА

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ўпэўнены: за гады незалежнасці краіна набыла моц для паспяховага пераадолення крызісаў.

Віктар ШЧЭЦЬКА, старшыня Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы:

— Беларусь за перыяд сваёй незалежнасці сапраўды стала краінай у поўным сэнсе гэтага слова — самастойнай, паўнавартаснай дзяржавай, якая не з'яўляецца нічыім прыдаткам.

Усе разумеюць, што калі б мы пайшлі адразу пасля развалу Савецкага Саюза па шляху Расіі або краін Прыбалтыкі, то не змаглі б падняцца ніколі. Мы захавалі нашы заводы — Мінскі трактарны, Беларускі аўтамабільны... Мы не закінулі сельскую гаспадарку — нават у Расіі яна прыйшла ў заняпад, і цяпер велізарныя сродкі там укладваюцца, каб яе аднавіць. Наша сельская гаспадарка — вялікае дасягненне ўвогуле. Калі б мы не захавалі яе, то аднавіць не змаглі б, бо не маем такіх рэсурсаў, як суседзі.

Што да будучыні, то хацелася б, каб нарэшце сітуацыя наладзілася ва Украіне, у Расіі, і яны зноў змаглі ў ранейшых аб'ёмах закупаць нашу прадукцыю.

Валерый КОКАШ, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі:

— Раскажу, як змянілася мая акруга, а гэта Смаргонскі і Астравецкі раёны. Калісьці ў вёсцы Солы на Смаргоншчыне была буйная фабрыка па вытворчасці індычынага мяса. Пасля яна прыйшла ў заняпад. Сёння ж гэта зноў адна з лепшых фабрык у вобласці.

Што да Астраўца, то там прайшла значная частка майго жыцця. Раней там жыло прыкладна шэсць тысяч чалавек, аднак горад будуецца, развіваецца — і ў хуткім часе колькасць жыхароў у ім перавысіць 30 тысяч. Паралельна будаўніцтву атамнай электрастанцыі развіваецца інфраструктура горада і раёна. Сёлета на будаўніцтва ў Астраўцы жылля, аб'ектаў культуры і быту выдзелены адзін трыльён трыста мільярдаў рублёў. У хуткім часе колькасць будаўнікоў у горадзе дасягне 9,5 тысячы, у будучыні ж на самой станцыі будуць працаваць 2,2 тысячы чалавек. З увядзеннем у эксплуатацыю абодвух блокаў АЭС — першага ў 2018-м, другога — у 2020 годзе дзяржава зможа сэканоміць на электраэнергіі прыкладна 1,8 мільярда долараў у год.

Міхаіл САВАНОВІЧ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах:

— Што хочацца адзначыць, дык гэта добраўпарадкаванне, рост нашых гарадоў. Нядаўна быў у Слуцку — дык яго не пазнаць: прыгожы, чысты і ўтульны горад. Што да Мінска, то ён таксама вельмі змяніўся, з'явілася шмат новых мікрараёнаў. Яшчэ не так даўно на Каменнай Горцы расла капуста — сёння гэта велізарны раён. На тым месцы, дзе цяпер знаходзіцца Нацыянальная бібліятэка, калісьці рос сад. Сёння ж там — новы мікрараён з бібліятэкай і комплексам «Маяк». Маскоўскі раён таксама разросся, акрамя Малінаўкі, там цяпер ёсць такія мікрараёны з новабудоўлямі, як Грушаўка, Міхалова, Брылевічы... Да непазнавальнасці змяніўся праспект Дзяржынскага.

Што да будучыні, то хутка цяперашні крызіс скончыцца. Улічваючы той факт, што мы захавалі нашы прадпрыемствы, праз пару гадоў усё пачне цудоўна развівацца, і наша краіна стане адной з найлепшых краін Еўропы.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Праз сэрца

Таццяна СІВЕЦ, пісьменніца, журналістка

КАБ ЛЮБІЦЬ... КАБ ЗАСТАЦЦА

Я з таго пакалення, што нарадзілася і пайшло ў школу ў адной краіне, а атэстат сталасці атрымлівала ў зусім іншай. Памятаю буквар з партрэтам Леніна і пустыя паліцы ў крамах, чаргу па смятану, у якой трэба было стаяць са сваім слоікам. Памятаю, як з тэлеэкранаў нам пачалі паказваць неверагодны каляровы свет — усіх гэтых «кэпвэлаў», «простамарый» і багатых, якія ўвесь час плакалі, стваральчы адчуванне, што вось там, за мяжой, сапраўднае жыццё. Як у показцы таго часу: «Куды б ты хацеў паехаць? — У Санта-Барбару. Я ж там усіх ведаю...» Многія мае аднакласнікі марылі з'ехаць туды, дзе жыццё здавалася такім бліскучым і каляровым, як укладышы ад жуйкі, што паланілі дзіцячыя сэрцы. Сказаць маёй пляменніцы, што колісь жуйка магла быць выдатным падарункам на дзень народзінаў? Не, не зразумее. І гэтае адчуванне робіць мяне шчаслівай. Справа не ў тым, што на паліцах сёння можна знайсці ўсё што захочаш, а ў тым, што ў сучасных дзяцей ёсць выбар. Большы за жуйку/снікерс. Яны не мусяць пасля дзевяці класаў уладкоўвацца хоць на якую працу, каб падтрымаць сям'ю, а могуць атрымліваць сярэднюю ці вышэйшую адукацыю, пасля якой зноў-такі могуць выбіраць, дзе працаваць; яны могуць выбіраць музыку, кнігі, вопратку, сяброў (у тым ліку і на іншым канцы свету, дзякуючы інтэрнэту); яны могуць выбіраць, куды паехаць адпачываць і дзе жыць... Дарэчы, многія з тых, хто з'ехаў у 1990-я, вярнуліся. Каб застацца. І гэта іх Выбар.

Калі б мне ў дзяцінстве сказалі, што я пабачу не толькі гарады Беларусі, Маскву, Піцер, але і Парыж, Берлін, Амстэрдам, Варшаву, Баку, Браціславу, Батумі ды іншыя мясціны, я б не паверыла, напэўна. Сёння я думаю, што пабачыла пакуль не так і шмат. Зрэшты, у першым класе, дзе вучыцца мая пляменніца, усе дзеці без выключэння ляталі за мяжу. Па-праўдзе, пра якія межы вядзецца размова, калі іх сёння практычна няма! У тры гады малыя «інтэрнэт-карыстальнікі» ўжо абменьваюцца «лайкамі» на «Фэйсбуку» з сябрамі з іншых краін. Кепска гэта ці добра? Мяркую, што хутчэй добра, бо дае шанц шукаць у сеціве інфармацыю, цікавых людзей і добрыя творы. Так! З'ява апошняга часу — герояў робіць інтэрнэт: менавіта тут «раскручваюцца» аўтары і сустракаюцца паэты з кампазітарамі ці мастакі з літаратарамі. І няхай ім няма дваццаці гадоў, затое ў іх процьма праектаў і задум, яны гуртуюцца, «развіртуальваюцца» і ствараюць новае жыццё — магчыма, якраз такое, пра якое марылі ў дзяцінстве.

І самае цікавае, яны ўсё яшчэ пішуць вершы! І захапляюцца класікай (праўда, класіка ў іх разуменні крыху іншая)! І прыносяць іх, саромеючыся ды са здзіўленнем (а што, праўда, можна?), у «ЛіМ», «Маладосць», «Бярозку»... А пасля «перапошчваюць» сканы ці PDF-старонкі ў сваіх блогах. Яны гатовыя чытаць вершы нават на прыступках, як было падчас выстаўкі «СМІ ў Беларусі», калі гукі сцэны заглушалі галасы маладых творцаў — і літаратурныя чытанні з агульнай згоды было вырашана перанесці на вольнае паветра. Прыпыняліся, каб паслухаць маладых, і пенсіянеры, і маладыя жанчыны з дзецьмі, а некаторыя са слухачоў раптам самі выцягвалі з сумкі пашарпаныя нататнікі і прасілі дазволу «таксама пачытаць»...

У кожнай з краін, куды я трапляю, я пытаюся ў моладзі: «Каго з вашых пісьменнікаў вы ведаеце?» Называюць адно, сама болей два прозвішчы. Нават смешна было, калі ў цэнтры Баку я запыталася ў паліцэйскага, ці ведае ён творцу, якога завуць Анар, а ён адказаў, што не чуў пра такога. Між іншым, гэта старшыня Саюза пісьменнікаў Азербайджана, адзін з выдатных аўтараў гэтай краіны. Уявіць сабе аналагічную сітуацыю ў нас, думаю, цяжка. І яшчэ адно назіранне: нам, беларусам, усё больш зайздросцяць суседзі па СНД. Класічнае «ў вас спакойна» хутка можа ператварыцца ў яшчэ адзін брэнд Беларусі. Без жартаў, гэта мне казалі і грузіны, і азербайджанцы, і рускія з украінцамі...

Краіна, дзе чытаюць вершы...
Краіна, дзе вершы пішуць...
Краіна, куды хочацца вяртацца
з усіх падарожжаў... Краіна, дзе спакойна...

Беларусь. Мая!

■ Добрая навіна

Білеты праз тэрміналы — цяпер і для дзяцей

Беларуская чыгунка пашырае магчымасці тэрміналаў самаабслугоўвання. З мэтай развіцця безнаяўных разлікаў і каб пашырыць даступнасць паслуг, была праведзена дапрацоўка іх праграмнага забеспячэння. Дзякуючы гэтаму цяпер праз тэрміналы можна набыць праязны дакумент для дзяцей да сямі гадоў.

У прэс-цэнтры магістралі нагадалі, што ў адпаведнасці з правіламі перавозак пасажыраў, багажу і грузабагажу чыгуначным транспартам агульнага карыстання ў цягніках рэгіянальных ліній эканом-класа, гарадскіх ліній пасажыр мае права правозіць з сабой дзяцей ва ўзросце да сямі гадоў з афармленнем бясплатнага білета. Аформіць бясплатны праязны дакумент для такіх дзетак-пасажыраў праз тэрмінал можна толькі разам з білетам, набытым па поўным тарыфе.

Сёння на Беларускай чыгунцы ўстаноўлены 74 плацежна-даведачныя тэрміналы на шэрагу станцый і прыпыначных пунктаў, і праца па пашырэнні іх сеткі працягваецца. Камісійны збор пры набыцці білетаў праз тэрміналы самаабслугоўвання не бярэцца. Набыць праязныя дакументы можна з выкарыстаннем картак усіх банкаў краіны.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■ Сваё не горшае

ПАВЯТОВЫЯ РЭЦЭПТЫ І БАБУЛІНЫ АГУРКІ

Стаўбцоўскія вытворцы перайшлі на імпартазамяшчэнне

У стаўбцоўскім філіяле адкрытага акцыянернага таварыства «Гарадзейскі цукровы камбінат» рэалізаваны імпартазамяшчальны праект па вытворчасці фруктова-ягадных напаўняльнікаў для малочнай і кандытарскай прамысловасці коштам у 65 млрд рублёў. Сёння гэта адзінае ў нашай краіне прадпрыемства, якое выпускае такую прадукцыю.

Напаўняльнікі прымяняюцца для вытворчасці зерневага тварагу, глазураваных сыркоў, тварожнай пасты, кефіру, ёгурту, марожанага і іншых прадуктаў з малака. Усе напаўняльнікі натуральныя — з клубніц, вішні, чарніц, бруснiц, маліны, груш, яблыкаў, чорных і чырвоных парэчак, журавін, чарэшні. Вырабы пастаўляюцца 13 малакаперапрацоўчым прадпрыемствам Беларусі. Калі раней напаўняльнікі цалкам імпартаваліся, то ў мінулым годзе пачалася іх пастаўка за межы краіны — у Расійскую Федэрацыю.

— Гэта стала магчымым дзякуючы маштабнай рэканструкцыі завода, якая прайшла ў сціслыя тэрміны — на працягу 2013 года. У выніку ўстаноўлена сучаснае тэхналагічнае абсталяванне, пабудаваны склады для захоўвання гатовай прадукцыі і паўфабрыкатаў, мадэрнізавана сховішча для агародніны, — расказаў **дырэктар філіяла Сяргей ПРАСМЫЦКІ**.— Новыя тэхналогіі дазволілі адмовіцца ад прадукцыі ў састарэлых трохлітровых слоіках савецкай эпохі і перайсці на выпуск сокаў і нектараў у інавацыйнай упакоўцы bag-in-box аб'ёмам 5 і 10 літраў. У такой ёмістасці спажыўцам прапануюцца розныя змяшаныя кампазіцыі сокаў на натуральнай аснове: бярозава-яблычны, бярозава-апельсінавы, бярозава-трапічны, бярозавы з дабаўленнем духмяных траў. Ацанілі пакупнікі і нектары: яблычны, з яблыкаў і клубніц, яблыкаў і морквы. Паводле дагавораў, бярозавік на прадпрыемства пастаўляюць лясгасы вобласці.

Сёлета пачаўся выпуск сокаў і нектараў аб'ёмам 0,25 літра ў шкляной тары. У ёй прадукцыя найлепшым чынам захоўвае свае харчовыя ўласцівасці працяглы час.

Вырабы рэалізуюцца як у Беларусі, так і за мяжой: Расія, Казахстан, Узбекістан, Арменія. Прапрацоўваецца прамая пастаўка сокаў у Кітай.

Усяго з пачатку года на экспарт адпраўлена прадукцыі на 1 млн долараў.

Тут таксама соляць агуркі, зялёныя памідоры, квасяць капусту па старых народных рэцэптах. Паступаюць яны ў продаж у вакуумнай упакоўцы па 400 і 600 грамаў. Пад брэндамі «Павятовыя рэцэпты» і «Вегетэль» адпаведна экспартуецца кабачковая ікра і нектары з морквы. Асвоілі на прадпрыемстве выпуск таматных соусаў, пюрэ.

Сыравіну пастаўляюць гаспадаркі раёна. Садавіна паступае таксама і з уласных падворкаў: «Сінява» і «Малева», дзе вырошчваюцца яблыкі, суніцы, маліны, чорныя і чырвоныя парэчкі, дурніцы.

У будучым на заводзе плануюць перапрацоўваць дары лесу: ягады і грыбы. Што, зрэшты, адкрывае добрыя перспектывы для лясных гаспадарак Міншчыны.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

Акадэмік Пётр НІКІЦЕНКА:

«МАЛАЯ РАДЗІМА — САМАЯ БЛІЗКАЯ І ЛЮБІМАЯ»

На пытанні нашага карэспандэнта адказвае саветнік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмік, доктар эканамічных навук, прафесар, стваральнік беларускай міжнароднай навуковай школы інавацыйнага і наасфернага ўстойлівага развіцця, эксперт Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН Пётр Нікіценка.

— Нядаўна ў рамках аднаго міжнароднага экалагічнага праекта разам з іншаземцамі з розных краін свету, у прыватнасці з прадстаўнікамі расійскай Рэспублікі Комі, мне давялося наведаць палескую глыбінку. Іх рэакцыя была адназначнай: убачанае і пачутае пераўзышло іх чаканні.

— Відаць, гасцей больш за ўсё ўразілі нашы дарогі?

— Так, асабліва ў райцэнтрах, пасёлках і нават у вёсках.

— Я не здзіўляюся. Аб узроўні жыцця жыхароў любой краіны, ступені яе эканамічнага развіцця можна меркаваць па дарогах, у тым ліку і па мясцовых. Мне прыемна адзначыць, што па якасці дарог Беларусь выглядае лепш за некаторыя еўрапейскія краіны, напрыклад, Польшчу. І што характэрна, паступова дарогі ў глыбінцы падцягваюцца да сучасных стандартаў. Вядома, тут яшчэ вялікае поле дзейнасці для паляпшэння і ўдасканалення, але ў цэлым нашы дарогі нармальныя, а прыдарожныя тэрыторыі пастаянна добраўпарадкоўваюцца і набываюць цывілізаваны выгляд. Увогуле, мне давялося наведаць нямала еўрапейскіх краін, неаднаразова бываў у Германіі, праехаў дарогамі Амерыкі і Аўстраліі. І магу канстатаваць: узровень іх дарог адпавядае напаўненню іх крам.

— А ў нас адпавядае?

— Вядома. Калі збочыць з трасы і завітаць у сучасную краму, то мы ўбачым запоўненыя разнастайнымі харчовымі і прамысловымі таварамі паліцы. Так, можна скардзіцца на тое, што цэны часам кусаюцца, але дэфіцыту і абрыдлых у савецкія і першыя паслясавецкія часы чэргаў няма. Праблема харчовай бяспекі ў нас вырашана цалкам. Хочацца адзначыць поўную забяспечанасць сем'яў дзіцячым харчаваннем з натуральных інгрэдыентаў. Гэта бясспрэчнае дасягненне.

Усё пазнаецца ў параўнанні. Я дзіця вайны. Мая малая радзіма Віцебшчына. Таму мне відаць станоўчыя змены ў жыцці нашага народа: ад голаду, нястачы, разрухі — да сённяшняга дабрабыту. Асабліва хачу адзначыць перыяд пасля набыцця незалежнасці. Хоць яго пачатак быў надзвычай складаны, супярэчлівы, нярэдка нагадваў асобныя моманты першых пасляваенных гадоў: татальны дэфіцыт, мізэрныя зарплаты, разруха на вытворчасці і ў галовах і г. д. Тым не менш той перыяд быў паспяхова пераадолены, і сёння мы маем беларускую дзяржаву, якая за 20 гадоў прайшла шлях ад савецкай рэспублікі да самадастатковай суверэннай краіны. У ёй забяспечана суверэннае развіццё і мірная стваральная праца. Назіраецца практычна поўная занятасць насельніцтва, станоўчы дэмаграфічны трэнд, прырост назапашвання чалавечага розуму і якасці жыцця народа. Дынаміка росту валавога ўнутранага прадукту на 100 працэнтаў адбываецца на аснове інтэнсіўных і інавацыйных фактараў: развіцця навукі і навукова-тэхнічнага прагрэсу.

— Часам можна чуць скаргі на тое, што нашы нетры бедныя, вельма мала карысных выкапняў...

— На мой погляд, гэта разважанні людзей недасведчаных. Акрамя вуглевадародаў і прыроднага газу, чалавецтву патрэбны іншыя рэсурсы, на якія багатая наша зямля. Напрыклад, вада. Яна — магутны рэзерв будучых пакаленняў беларусаў. Ад якасці вады ў значнай ступені залежыць здароўе чалавека, яго фізічнае і разумовае развіццё. Беларусь валодае значнымі запасамі прэснай вады. У яе нетрах ёсць усе віды мінеральнай вады. Нашы нямецкія партнёры нам з зайздрасцю так і кажуць: «Вы да канца не ўяўляеце, якім багаццем валодаеце».

✓ «Падаткамі можна так зацiснуць любое прадпрыемства, што яно перастане дыхаць. А дадайце сюды шматлікія праверкі, штрафы і г.д. Іх таксама неабходна абмежаваць».

Бясспрэчна, з часам вада будзе станавіцца ўсё больш важным рэсурсам, чым нафта. Ваду можна будзе не толькі экспартаваць. Сёння даволі выгаднай справай становіцца медыцынскі турызм. Дык чаму б на нашых прыродных водах не развіваць яго? Праўда, для гэтага прыйдзецца ствараць у глыбінцы санаторна-курортныя ўстановы. А на гэта і інвестыцыі патрэбны, і кадры адпаведнай кваліфікацыі. Аднак можна выкарыстоўваць патэнцыял аграсядзіб, мясцовых медыцынскіх устаноў. Галоўнае — захацець распачаць новую справу.

— Але часам намаганні і памкненні людзей разбіваюцца аб рэалii жыцця. Напрыклад, няма стартавага капіталу для пачатку ўласнай справы, а крэдыты ў банку дарагія. Як дапамагчы ў гэтай сітуацыі?

— Мне здаецца, што ў кожным рэгіёне павінна быць свая дакладная стратэгія развіцця мясцовай эканомікі. І тычыцца яна павінна не толькі прадпрыемстваў рознай формы ўласнасці. Акцэнт варта зрабіць на ўсебаковай падтрымцы індывідуальнага прадпрымальніка, сямейнага бізнесу як у вытворчасці, так і ў сферы паслуг. Сёння вядзенне хатняй гаспадаркі, клопаты па выхаванні дзяцей павінны стаць прыярытэтным напрамкам дзейнасці мясцовай улады, годна аплачвацца, уваходзіць у працоўны стаж і лічыцца нармальнай занятасцю.

— Жыццё пасля выбараў, трэба спадзявацца, набудзе новы подых і новыя арыенціры. Што, на ваш погляд, неабходна зрабіць у эканоміцы ў першую чаргу?

— Для ўсіх суб'ектаў гаспадарання стварыць аднолькавыя ўмовы. І ў сталіцы, і ў абласных і раённых цэнтрах, і ў глыбінцы. Падатковая сістэма павінна быць адзінай для ўсіх. Адзіныя падаткі павінны быць і на дабаўленую вартасць, прычым прымальныя падаткі — не больш за адну траціну ад створанай вартасці. Трэба плаціць грошы за працу не па тарыфах і ад займанай пасады, а ад эфектыўнасці вытворчасці, арганізацыі, установы. Для гэтага даць прадпрыемствам свабоду, якая наўпрост залежыць ад падатковай сістэмы. Падаткамі можна так зацiснуць любое прадпрыемства, што яно перастане дыхаць. А дадайце сюды шматлікія праверкі, штрафы і г. д. Іх таксама неабходна абмежаваць.

— Апошнім часам гучаць прапановы і выказваюцца думкі аб пераасэнсаванні ролі і месца банкаў у эканоміцы краіны. Што вы думаеце з гэтай нагоды?

— Своечасовая дыскусія. У банках многіх краін свету працэнты за крэдыты для бізнесменаў-пачаткоўцаў мінімальныя, нярэдка зусім нулявыя. Таму надышоў час і нашым банкам заняць больш канструктыўную пазіцыю.

Грашова-крэдытную сістэму неабходна максімальна прыстасоўваць да патрэб эканомікі, якая з'яўляецца крытэрыем эфектыўнасці сацыяльна-арыентаванай мадэлі беларускай дзяржавы, важнай умовай яе ўстойлівага інавацыйнага развіцця. Нашым банкам трэба працаваць на інвестыцыйным працэнце. Гэта значыць, фінансава ўдзельнічаць у стварэнні бізнесу, мець сваю долю даходу, а не жыць выключна на працэнты ад высокіх крэдытаў. Іх трэба паварочваць да інтарэсаў рэальнай эканомікі.

Увогуле, час заўсёды дыктуе народу арыенціры захавання суверэннай жыццядзейнасці. Нам трэба жыць сваім розумам, з апорай на ўласныя сілы, без пазык.

Гутарыў Леанід ТУГАРЫН.

■ Увага да праблемы

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД

Што можа змяніцца пасля падпісання Канвенцыі аб правах інвалідаў?

У канцы верасня Беларусь далучылася да Канвенцыі аб правах інвалідаў. Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Падзея, важная для паўмільёна грамадзян (менавіта столькі людзей з асаблівасцямі ў развіцці пражывае ў нашай краіне). Канвенцыя лічыцца адным з самых перадавых дакументаў па правах чалавека, які ўлічвае досвед папярэдняга заканадаўства. У ёй акцэнтуецца ўвага на тым, што праблема інваліднасці не ў парушэнні здароўя, а ў дыскрымінацыі. Бар'еры ў асяродку, а не хвароба, перашкаджаюць чалавеку ўключыцца ў грамадства і робяць недаступнымі шэраг правоў. Падпісаўшы канвенцыю, Беларусь бярэ на сябе пэўныя абавязкі: не ствараць дыскрымінацыйных нормаў у дачыненні да інвалідаў, імкнуцца да інклюзіі, прымяняць універсальны дызайн. Якія канкрэтныя дзеянні патрэбны ў гэтым напрамку і чаму ўмяшанне дзяржавы ў сітуацыю абавязковае?

НЕ НОВЫЯ ПРАВЫ, А ЎДАКЛАДНЕННЕ ПАПЯРЭДНІХ

Прапанова далучыцца да канвенцыі гучала ад грамадскіх арганізацый яшчэ сем гадоў таму. Пазней, у 2009-2010 гадах, Мінпрацы сумесна з ААН правялі маштабнае даследаванне. Вывучылі становішча людзей з інваліднасцю ў краіне, прааналізавалі, наколькі наша заканадаўства адпавядае канвенцыі. І не знайшлі супярэчнасцяў.

— Некаторыя баяцца, што інваліды праз гэту канвенцыю спрабуюць выбіць сабе новыя прывілеі, — кажа **каардынатар Офіса па правах людзей з інваліднасцю Сяргей ДРАЗДОЎСКІ.** — Але канвенцыя не нясе ніводнага права, якога б не было ў беларускай Канстытуцыі. Яна проста ўдакладняе гэтыя правы, прапаноўвае канкрэтныя меры вырашэння праблемы інваліднасці. Праграмы па паляпшэнні ўмоў жыцця людзей з асаблівасцямі ў развіцці павінны распрацоўвацца не ў вярхах. Не ведаеш на мясцовым узроўні, што варта зрабіць, — спытай у самога інваліда. Размовы пра тое, што адпавядаць патрабаванням канвенцыі вельмі дорага, таксама няпраўда. Як паказвае замежная практыка, колькі грошай грамадства раней траціла на вырашэнне праблем інваліднасці, столькі будзе выдаткоўваць і цяпер. Пытанне ў тым, каб іх аптымальна выкарыстаць.

Падпісанне канвенцыі — толькі першы крок. Далей неабходна ратыфікаваць дагавор (уключыць у заканадаўства краіны) і прывесці да яго нормаў беларускае права і практыку. Сяргей Драздоўскі мяркуе, што ратыфікацыю можна зрабіць ужо ў наступным годзе: Беларусь гатова да яе больш за многіх суседзяў. Аднак, на думку эксперта, у айчынным заканадаўстве ёсць недахопы. Мы дэкларуем недыскрымінацыю і кажам, што арганізуем грамадства так, што будуць забяспечвацца роўныя правы. У той жа час у заканадаўстве адсутнічае інстытут забароны дыскрымінацыі (для тых сітуацый, калі нормы не выконваюцца), уласцівы сусветнай практыцы. Не зусім карэктная і працэдура пазбаўлення дзеяздольнасці. Яна не ўлічвае, што кожны выпадак псіхічнага захворвання індывідуальны. Такі падыход выводзіць вялікую колькасць людзей з грамадзянскага стану. Фактычна чалавек, прызнаны недзеяздольным, пазбаўляецца доступу да 17 правоў!

КАМФОРТ НЕ ПАТРАБУЕ ЗВЫШВЫДАТКАЎ

Паводле канвенцыі, дзяржава павінна ствараць умовы, каб людзі з асаблівасцямі ў развіцці жылі самастойна, у звычайных месцах, а не ў спецыяльна адведзеных для гэтага ўстановах.

— Інтэрнаты не спрыяюць інклюзіі, бо вымаюць чалавека з грамадства, — звяртае ўвагу Сяргей Драздоўскі. — Калі сям'я жыве і ведае, што як толькі іх родзіч стане хворым, яна зможа ад яго пазбавіцца, гэта падрывае салідарнасць.

На незалежны лад жыцця і поўную рэалізацыю сваіх правоў інваліды могуць разлічваць толькі ў безбар'ерным асяродку. І ў гэтым пытанні сістэмнасць абавязковая. Будаўніцтва не павінна зводзіцца да стварэння нейкай колькасці спецыяльных элементаў: так мы не зробім горад цалкам даступным. Канвенцыя абавязвае таксама старацца забяспечыць аб'екты, адкрытыя для насельніцтва, знакамі, выкананымі Брайлем у чытабельнай і зразумелай форме. Будынак, камфортны для ўсіх, не патрабуе нейкіх звышвыдаткаў. Калі закладваць даступнасць на этапе праектавання, узвядзенне дома ці офіса падаражэ толькі на 2-10 працэнтаў. Два працэнты — гэта на ўзроўні звычайных страт, ад дажджоў ці крадзяжоў матэрыялаў. Дзесяць працэнтаў у нас на будоўлі губляецца і цяпер. Для параўнання: зрабіць зручным для інвалідаў ужо гатовае памяшканне можа каштаваць палову ад сумы, выдаткаванай на сам будынак. Таму прыстасаванне аб'ектаў потым амаль ніколі немагчыма ў поўнай меры.

НАВУЧАННЕ Ў ІНТЭГРАВАНЫХ КЛАСАХ

Асобны артыкул канвенцыі тычыцца інклюзіўнай адукацыі. Галоўны яе прынцып — усе вучацца па агульнай праграме, але з індывідуальнымі планамі. І, трэба сказаць, дзяржава ўжо ўзялася за гэты напрамак. Сёлета з'явілася канцэпцыя развіцця інклюзіўнай адукацыі для асоб з асаблівасцямі ў развіцці. Пакуль гэта толькі агульны план дзеянняў. Каб сістэма запрацавала належным чынам, трэба прыняць яшчэ шэраг лакальных дакументаў, якія канкрэтызавалі б патрабаванні да навучальных устаноў і задачы педагогаў.

— Да адукацыі нельга падысці аднабока, — каментуе **дырэктар грамадскай арганізацыі «Дзеці. Аўтызм. Бацькі» Таццяна ЯКАЎЛЕВА.** — Усё павінна рэгулявацца па асобных катэгорыях. Сёння школьнікі з аўтызмам, напрыклад, вымушаны вучыцца па праграмах для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю ці з затрымкай псіхічнага развіцця. Што, вядома, не ўлічвае іх разумовых здольнасцяў. Патрэбна нацыянальная міжведамасная праграма, дзе б спалучаліся пытанні адукацыі, медыцыны, сацыяльнай дапамогі.

Вопыт інтэграваных класаў у Беларусі ўжо ёсць. Адкрыць іх, зразумела, складаней, чым звычайныя. Хаця б з фінансавага боку: адзін такі клас — абсталяванне і падрыхтоўка спецыялістаў — абыдзецца ў дзясяткі тысяч долараў. Для тых жа дзяцей з аўтызмам абавязковы рэсурсны пакой. Неабходны псіхолагі, што займаюцца паводзінамі; цьютары, без якіх сістэма не запрацуе. Трэба павышаць кваліфікацыю спецыялістаў, пачынаючы ад дэфектолага і заканчваючы кожным настаўнікам-прадметнікам, каб тыя ведалі аб асаблівасцях той ці іншай катэгорыі дзяцей. Ва ўсім гэтым маюць патрэбу і звычайныя школьнікі, толькі не ў такой ступені.

— Сярод задач педагогаў не толькі навучанне, але і выхаванне. На сістэме адукацыі вялікая адказнасць, бо тое пакаленне, якое будзе развіваць ідэі інклюзіі, расце цяпер, — мяркуе Таццяна Якаўлева.

НЕ ЗАБАРОНА, А РЭКАМЕНДАЦЫІ ДА ПРАЦЫ

Па статыстыцы, большасць інвалідаў, што працуюць, заняты на пасадах, якія не прадугледжваюць кар'ернага росту. З розных прычын, аб'ектыўных і не вельмі, людзі з асаблівасцямі ў развіцці займаюць непрэстыжныя і нізкааплатныя вакансіі. Канвенцыя сцвярджае: некаторыя грамадзяне ніколі не змогуць канкураваць на роўных на рынку працы. Таму трэба ствараць умовы, у якіх гэтыя людзі будуць рэалізоўваць сябе з улікам іх магчымасцяў. Забяспечыць разумнае прыстасаванне рабочых месцаў, увесці спецыялізаваныя віды работ, наймаць інвалідаў у дзяржаўным сектары.

На працягу апошніх пяці гадоў беларускія медыкі спрабуюць укараняць новы, прагрэсіўны, падыход — выдаюць рэкамендацыі да працы. Урачы вызначаюць шэраг работ, якія чалавеку супрацьпаказаны, бо такім чынам ён будзе несці яўную бяспеку сябе і навакольлю. Але гэта не значыць, што яму забаронены астатнія прафесіі.

А што рабіць з наймальнікамі, якія ў сілу сваіх забабонаў адмаўляюцца прымаць на працу адукаваных і здольных інвалідаў? Самы распаўсюджаны інструмент рэгулявання гэтага пытання — штрафы. У некаторых краінах (Польшча, Германія) прадпрыемствы, штат якіх перавышае, напрыклад, 20 чалавек, абавязаны захоўваць квоту інваліднасці. А значыць, арганізацыя павінна забяспечыць працай пэўную колькасць людзей з асаблівасцямі. Не робіце гэтага — кампенсуйце. І прадпрыемствы выплачваюць сумы па неўладкаванні кожнай вакансіі, прызначанай для інваліда. Гэтыя сродкі паступаюць у спецыяльныя фонды і не трацяцца больш ні на якія мэты, акрамя стварэння новых працоўных месцаў для людзей з парушэннямі ў развіцці, садзейнічання іх занятасці і рэабілітацыі.

На думку экспертаў, дзяржаўнае ўмяшанне ў сітуацыю абавязковае.

— Злучаныя Штаты часта ставяцца ў прыклад, калі закранаецца пытанне становішча інвалідаў. Але калі амерыканцы ў 1991 годзе прымалі закон аб людзях з асаблівасцямі ў развіцці, гэта быў скандал, — кажа Сяргей Драздоўскі. — Праціўнікі праводзілі дэманстрацыі, бо гэты дакумент прадугледжваў жорсткія захады. Парушаеш правы — плаці штрафы. Частка грамадства ніколі не будзе гатова да талерантнасці ў гэтым пытанні. Таму і існуе інструмент дзяржаўнага прымусу, каб уздзейнічаць па некаторых пазіцыях.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ Нацыянальны каларыт

ЦЯПЛО З АБЯРЭГАМ

Магілёўскія вытворцы газавых катлоў упрыгожваюць сваю прадукцыю выявамі старажытных сімвалаў

Быў час, калі беларусы наогул не абыходзіліся без розных там абярэгаў і талісманаў. Ведалі, што гэта нейкім чынам абароніць іх ад розных бед. Пра народныя традыцыі вырашыў нагадаць айчынны вытворца газавага абсталявання — завод «Віктары». Бо хто, як не яны, клапоціцца пра надвор'е ў доме? Акрамя таго, стужкі з беларускімі арнаментамі прыдаюць тавару нацыянальны каларыт. Спажыўцам гэта падабаецца.

КІРАВАЦЬ ТЭМПЕРАТУРАЙ ПРАЗ МАБІЛЬНІК

— У нас цэлая калекцыя абярэгаў — на любы густ, — усміхаецца **маркетолаг прадпрыемства Аксана КОВАЛЬ.** — Вось гэта сімвал багатага чалавека, а ёсць яшчэ сімвал жаночай долі, маці-берагіні, Купалля. Сёння шмат хто жыве «па фэншуі», а мы вырашылі звярнуцца да славянскіх каранёў. Дорым гэтыя налепкі нашым спажыўцам, каб яны ведалі, што мы сапраўды клапоцімся пра іх.

Наогул прадпрыемству ёсць чым ганарыцца. Нядаўна яны сталі пераможцамі рэспубліканскага конкурсу «Лепшы айчынны прадукт года-2015». Перамогу прынёс кацёл з дыстанцыйнай сістэмай кіравання пры дапамозе мабільнага тэлефона. Падобнымі фішкамі можа пахваліцца далёка не кожны замежны брэнд. З дапамогай амаль любога мабільніка можна на адлегласці павышаць або паніжаць тэмпературу, атрымліваць інфармацыю аб праблемах.

— Мы пастаянна знаходзімся ў пошуку, — кажа **дырэктар завода ацяпляльнага абсталявання «Віктары» Уладзімір СЫСУН.** — На сёння выпускаем газавыя катлы магутнасцю ад 18 кілават да 33, як з адным цеплаабменнікам, так і з двума. Прапаноўваем таксама газавыя калонкі, якія прымяняюцца і ў прыватным сектары і пры ацяпленні кватэр. У распрацоўцы 50-кілаватны кандыцыйны кацёл. Гэта больш новая мадэль, сучасная ў сэнсе энергазберажэння, экалогіі. Яна прызначана для прамысловых збудаванняў, дзе ў ацяпленні маюць патрэбу вялікія плошчы.

ВА ЎМОВАХ ЖОРСТКАЙ КАНКУРЭНЦЫІ

Праграма імпартазамяшчэння сёлета актуальная, як ніколі. Каму гэта не ведаць, як магілёўскаму вытворцу газавага абсталявання. Бо прадпрыемства і стваралася як імпартазамяшчальнае. Сваю функцыю яно выконвае. Але барацьба за месца пад сонцам ідзе самая што ні на ёсць жорсткая.

— У нас ёсць свае прыярытэты, — аргументуе Уладзімір Сысун. — Жаданне прабіцца ўперад падахвочвае нас смялей выкарыстоўваць новыя тэхналогіі. Тая лінейка, якую мы выпускаем, адна з самых сучасных. Сэнсарная панэль кіравання, прыгожы дызайн, розныя «фішкі» накшталт абярэгаў і дыстанцыйнага кіравання. Мы таксама практыкуем камп'ютарную дыягностыку катла. Няма неабходнасці разбіраць яго, каб паглядзець, што там не так. Дастаткова далучыць блок, і ён выдасць, у чым прычына.

Па праграме імпартазамяшчэння пры газіфікацыі прыватнага сектара насельніцтву на 2 гады выдзяляюць ільготны крэдыт пад 3% гадавых. Раней пад гэтую праграму набывалі ў тым ліку і імпартныя катлы. Цяпер, калі чалавек жадае займець замежны тавар, ён пазбаўляецца льготы.

— І гэта вельмі справядліва, — лічыць дырэктар «Віктары». Чаму наша краіна павінна падтрымліваць чужую эканоміку? Трэба ствараць новыя працоўныя месцы не за мяжой, а на радзіме. Мы гэтым і займаемся. Камітэт дзяржкантролю дасканала праверыў нашу вытворчасць і зрабіў выснову, што мы не саступаем замежным брэндам.

МАЙСТАР-КЛАС НА КОЛАХ

Тэрмін жыцця любога катла — 15-20 гадоў. Але ад памылак у рабоце абсталявання ніхто не застрахаваны. Магілёўскі завод

Катлом лёгка кіраваць з дапамогай мабільніка.



Вось такія сімвалы можна ўбачыць на катлах «Віктары».

Таму мы знялі ролік і паказваем, можна сказаць, на пальцах. Нават дэталі з сабой возім, каб прадэманстраваць, з чаго сабрана абсталяванне. Крыўдна, калі прадукт добры, а яго нельга прадаць. Як я ўжо казаў, людзі не ведаюць сваіх беларускіх вытворцаў і «купляюцца» на маркі вядомых брэндаў. Яны пры гэтым не задумваюцца, што ў выпадку, калі тавар будзе няякасны, прыйдзецца камусьці яго рамантаваць.

На свае катлы мы даем 5 гадоў гарантыі, бо ўпэўнены ў якасці камплектуючых. Прадукцыя праходзіць жорсткі кантроль у лабараторыі, пра яе якасць сведчаць сертыфікаты адпаведнасці Рэспублікі Беларусь і Мытнага саюза. Нашы катлы надзейныя, зручныя ў эксплуатацыі, маюць прэзентабельны знешні выгляд. Ідэальна падыходзяць пад памер кухні — іх глыбіня 30 сантыметраў, шырыня — 36. Замежнікам зусім не цікава пастаўляць сюды навінкі, а мы ўлічваем усе асаблівасці нашых дамоў. У ацяпляльныя прыборы ўбудавана сістэма ад перападаў напружання. Кацёл наладжваецца нават па пратоку вады. Мы настройваем яго пад любое памяшканне, колькасць жыхароў. Бо зацікаўлены ў тым, каб кліент застаўся задаволены, а дзяржава была багатай.

Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.
zigulya@zviazda.by

КАМЕНТАР У ТЭМУ

Дзмітрый ЗАХАРАЎ,
начальнік упраўлення КДК Магілёўскай вобласці:

— Менавіта пры планавай праверцы гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства было паднятае пытанне аб задзейнічанні яго на поўную магутнасць. Бо пры наяўнасці ў Беларусі двух вытворцаў ацяпляльнага абсталявання (адзін з якіх завод «Віктары») ільготныя крэдыты пры газіфікацыі жыллёвага фонду выдаваліся ў тым ліку і на набыццё замежных аналагаў, якія саступалі айчынным як па цане, так і па асобных якасных характарыстыках.

У мэтах стварэння ўмоў для стымулявання айчынных вытворцаў ацяпляльнага абсталявання, скарачэння імпарту ў рэспубліку больш дарагіх аналагаў камітэтам былі ўнесены адпаведныя прапановы па выпраўленні сітуацыі, якая склалася. У выніку прапановы былі падтрыманы ўрадам. З мая гэтага года пры газіфікацыі жылфонду аб'ектам ільготнага крэдытавання можа быць ацяпляльнае абсталяванне толькі айчыннай вытворчасці або вытворчасці арганізацый краін — членаў ЕАЭС.

■ Раней за тэрмін

РАСЦІ ВЯЛІКАЙ, ЯСЕНІЯ!

95% немаўлят з нізкай вагой выжываюць дзякуючы сучаснаму лячэнню і догляду

Дзяўчынка з незвычайным імем нядаўна з'явілася на свет разам з брацікам Святаславам у клінічным радзільным доме Мінскай вобласці. На момант выхаду артыкула дзетак разам з мамай ужо выпісалі. Юлія, 27-гадовая жыхарка пасёлка Бараўляны, нават не паспела напалохацца: «Не думала, што так хутка нараджу». Роды пачаліся на 33-м тыдні. Тэрмін заўчасны, а значыць, мама з немаўлятамі павінна была правесці нейкі час у клініцы, дзе ў апошнія гады прымяняюцца сусветныя тэхналогіі для выходжвання неданошаных і малаважкіх дзетак.

Фота Надзеі БУЖАН.

— Усе заўчасныя роды Мінскай вобласці з тэрмінам цяжарнасці менш за 32 тыдні адбываюцца, галоўным чынам, тут, дзе ёсць магчымасці для аказання меддапамогі ў такіх выпадках, — кажа **загадчык аддзялення рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі нованароджаных Сяргей КАЧАН.** — Гэта можа быць жанчына з Капыля або, напрыклад, з Дзяржынска. Але на ўзроўні гарадской ці міжраённай медустановы ёй не дапамогуць, у нас жа ёсць спецыяльныя прэпараты, якія ў некаторых выпадках дазваляюць «прытрымаць» роды і даць магчымасць дзіцяці ўнутрывантробна саспець. Аднак у шэрагу выпадкаў дзеці ўсё ж нараджаюцца раней за тэрмін, прадугледжаны прыродай...

Штогод у аддзяленні пралечваюцца каля 500 дзяцей, большасць з якіх — неданошаныя, у тым ліку з вельмі нізкай вагой, менш за 1,5 кг. Для выходжвання такіх немаўлят патрабуюцца адпаведнае абсталяванне, інкубатары, а таксама спецыяльна навучаны персанал. У цэлым такія ўмовы ёсць ва ўсіх абласцях і РНПЦ «Маці і дзіця».

— Такія дзеці павінны прайсці вельмі цяжкі шлях, каб пазбегнуць інваліднасці або захворванняў, якія праявяцца ў будучыні, — дадае Сяргей Эдмундавіч. — Для правядзення дыягностыкі з мэтай прызначэння правільнага лячэння прыцягваюцца самыя розныя вузкія спецыялісты — нейрахірургі, кардыяхірургі, афтальмолагі, неўролагі, урачы ўльтрагукавой дыягностыкі...

У дзіцяці, якое нараджаецца датэрмінова, увесь арганізм абсалютна няспелы — сятчатка, слыхавы аналізатар, лёгкія, печань, кішэчнік... І неабходна крок за крокам вырашаць кожную выяўленую праблему, што і робіцца, як толькі немаўля пасля ўлоння маці трапляе ў інкубатар, у якім ствараюцца неабходныя тэмпература і вільготнасць паветра, а таксама кругласутачна кантралююцца частата сэрцабіцця, насычэнне крыві кіслародам...

Менавіта ў такім інкубатары знаходзіцца дзіця, якое нарадзілася з цяжкай прыроджанай інфекцыяй — спачатку яго падключылі да апарата штучнай вентыляцыі лёгкіх, але цяпер яно здольнае дыхаць ужо без «трубачкі». Другое дзіця, вагой 990 г, пачало дыхаць самастойна ўжо на другі дзень — дзякуючы спецыяльнай тэрапіі, лекаваму рэчыву сульфактант. Час знаходжання ў аддзяленні рэанімацыі залежыць ад стану дзіцяці. Быў выпадак, калі 520-грамовае немаўля выходжвалі цягам 3,5 месяца. Наогул вага, меншая за 1,5 кг, называецца вельмі нізкай, а калі менш за 1 кг — гэта ўжо экстрэмальна нізкая.

— У некаторых перынатальных цэнтрах краіны аснашчэнне лепшае, чым у нас, — нашым інкубатарам ужо 8 гадоў, — адзначае Сяргей Качан. — Аднак магчымасці выходжвання ва многім залежаць ад персаналу. А ў нас назапашаныя вельмі вялікі вопыт і навыкі ў тых жа медыцынскіх сясцёр, якія выдатна ўяўляюць, што неабходна рабіць. У выніку 95 працэнтаў нованароджаных з нізкай вагой выжываюць дзякуючы праведзеным лячэнню і догляду.

Унікальна, што матуль не выпісваюць асобна ад дзяцей, як гэта робяць у іншых перынатальных цэнтрах, — яны застаюцца тут, толькі паверхамі вышэй, і наведваюць малое адзін раз на дзень, а таксама перадаюць для кожнага кармлення грудное малако. Адначасова мамы навучаюцца таму, што і як рабіць, бо і пасля выпіскі малое патрабуе павышанай увагі. Скажам, дзіця, якое працягла знаходзілася на штучнай вентыляцыі лёгкіх, трапляе ў групу рызыкі па развіцці бронхалёгачнай дысплазіі, што з'яўляецца вельмі сур'ёзнай праблемай. Матуля павінна адсочваць і любыя змяненні з боку нервовай сістэмы — як малое рухаецца, як спіць, словам, шмат чаму трэба навучыцца, і такая магчымасць тут даецца.

Як толькі інтэнсіўная тэрапія праведзена і немаўля стала, кажучы мовай урачоў, стабільным па жыццёвых функцыях, яго пераводзяць у аддзяленне па выходжванні. У Мінскай радзільні яно разлічана на 25 ложкаў, хоць пацыентаў звычайна больш. За год праз аддзяленне праходзяць каля 270 неданошаных (гэта каля 70 працэнтаў усіх неданошаных дзяцей па вобласці).

— У нас знаходзяцца дзеці, якія ўжо не маюць патрэбы ў штучнай вентыляцыі лёгкіх, — тлумачыць **загадчыца педыятрычнага аддзялення для нованароджаных з перынатальнай паталогіяй і неданошаных Іна ВАЛЕНЦЮКЕВІЧ.** — Пачынаецца другі этап выходжвання. Кормім мы нашых немаўлят грудным малаком са спецыяльнымі дабаўкамі-«ўзмацняльнікамі» — яно больш якаснае, што якраз неабходна арганізму, які з 6 да 9 месяцаў расце надзвычай інтэнсіўна, а значыць, патрабуе адпаведнай колькасці калорый і спажыўных рэчываў. Крытэрыем для выпіскі становіцца стабільны стан дзіцяці — гэта прыблізна 36-ты тыдзень. Вага не з'яўляецца тут вызначальнай — мы выпісвалі і дзіця вагой 1 970 грамаў...

Некаторыя дзеткі знаходзяцца без матуль — яны толькі прыходзяць праз кожныя тры гадзіны, іншыя малыя — ужо ў палатах сумеснага знаходжання, разлічаных на дзвюх мам з дзецьмі. Гэта вельмі зручна, бо за маленькімі пацыентамі неабходна сачыць кожную хвіліну. У неданошанага дзіцяці можа быць і спыненне дыхання, ёсць пэўныя праблемы са стравараннем і г.д.

Юлія, мама Станіслава і Ясенii, кажа, што спіць «адным вокам», не можа адарвацца ад малютак. «Я і настроіцца не паспела, — кажа Юля. — Трапіла ў аддзяленне паталогіі, а там сказалі што ўжо адышлі воды, і зрабілі экстраннае кесарава сячэнне». Яе суседка, 28-гадовая Тэрэза, пяшчотна прыцiскае да сябе сваё малое: «З першым дзіцем не было ніякіх праблем — звычайная цяжарнасць, роды ў тэрмін і выпіска праз некалькі дзён, а тут... Мяне толькі паглядзелі, сказалі «вы ўжо ў родах» і адвезлі сюды... Гэта быў 32-гі тыдзень. Нарадзілася дзяўчынка — 1 670 грамаў, цяпер ужо, праўда, 2 100. Яшчэ крыху будзем расці, нас пакуль не выпісваюць».

У другой палаце можна ўбачыць, як дзіця знаходзіцца на маніторным назіранні — спецыяльны апарат памерам з маленькі тэлевізар дапамагае адсочваць дыханне і сэрцабіццё. А побач — немаўля на ложку з вадзяным матрацам «Рамонак», які выпускае беларускае прадпрыемства. Гэты цёплы матрац, які, дзякуючы сваёй форме, атрымаў ласкавую мянушку «гняздзечка», — вельмі карысная ў выходжванні рэч.

Святлана БАРЫСЕНКА.

protas@zviazda.by

Сярэдняя колькасць неданошаных у свеце застаецца пастаяннай. З вельмі нізкай вагой нараджаецца каля 2 працэнтаў усіх нованароджаных, з экстрэмальна нізкай — 0,5. Сёння ва ўсіх гэтых дзяцей існуе шмат шанцаў выжыць, дзякуючы развіццю медыцынскіх тэхналогій.

■ Вось гэта школа!

Я Ў ІТ-шнікі ПАЙШОЎ БЫ...

Дацэнт кафедры «Матэматычныя праблемы кіравання» матэматычнага факультэта Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны Міхаіл ДАЛІНСКІ ў пачатку 90-х стаў заснавальнікам школы юных праграмістаў. З таго часу яна дала свету шмат пераможцаў міжнародных алімпіяд, а потым і вядомых спецыялістаў у ІТ-сферы. Вось ужо на працягу многіх гадоў Міхаіл Сямёнавіч не толькі працягвае выкладаць у ВНУ, але і факультатыўна займаецца з дзецьмі ў школе №27. Серада і нядзеля — дні, безумоўна аддадзеныя школьнікам, якія, магчыма, хутка апраўдаюць спадзяванні вядомага настаўніка на новыя алімпійскія перамогі па праграмаванні.

Нагадаем, што вядомы на ўвесь свет вучань Міхаіла Далінскага — камп'ютарны геній Генадзь Караткевіч. Сёння ён — трэцякурснік універсітэта інфармацыйных тэхналогій, механікі і оптыкі ў Санкт-Пецербурзе. Юнак на працягу дзясятка гадоў з лёгкасцю выйграваў многія спаборніцтвы праграмістаў. Сёння Генадзь займае першае месца ў рэйтынгу Topcoder і Codeforces.

Дарэчы, ганарыцца Міхаіл Сямёнавіч усімі, хто чагосьці дасягнуў, але галоўнае — прыкладаў вялікія намаганні ў спасціжэнні інтэлектуальнай прафесіі:

— Галоўнае — гэта жаданне. У мяне калісьці на пятым курсе найлепшымі сталі тры студэнты. Два — пераможцы алімпіяд, а трэці ад нараджэння дрэнна чуў. Я спачатку не ведаў гэтага. Ён на першых курсах садзіўся на першую парту і ўгадваў, што расказвае лектар. Хлопец спачатку значна адставаў ад усіх, але потым не толькі нагнаў, але і стаў адным з самых лепшых. Ён меў жаданне спасцігаць, шмат працаваў і дабіўся свайго. Між тым праграмаванне можна назваць сацыяльнай лесвіцай, якую трэба прайсці сваімі нагамі, каб узлезці на пэўную вышыню. Але ж для гэтага трэба вельмі многа працаваць.

Зараз выкладчык ставіць перад сабой новыя задачы. Яны тычацца, напрыклад, удасканалення першага ў рэспубліцы сайта дыстанцыйнага навучання dl.gsu.by і заняткаў са школьнікамі пачатковых і сярэдніх класаў. У прыватнасці, цяпер у 1-4 класах на рэгулярнай аснове займаецца больш за 60 чалавек, а ў 5-8 класах — больш за 120. Урэшце, лічыць педагог, колькасць павінна перайсці ў якасць вынікаў на рэспубліканскіх і міжнародных алімпіядах.

Мы гутарым на занятках у аўдыторыі ГДУ імя Скарыны. Студэнты працуюць самастойна, але час ад часу звяртаюцца да выкладчыка. Ён імгненна ацэньвае пытанне і адразу ж накіроўвае юнака да аднакурсніка, які павінен растлумачыць незразумелае:

— Важна, калі яны растлумачваюць адзін аднаму і дапамагаюць рашаць задачы. Такім чынам вучацца абодва. Адзін ганарыцца не толькі ведамі, але і тым, што змог дапамагчы. Другі атрымлівае стымул ведаць не горш, чым сябар. Роўны растлумачвае роўнаму. Я заўсёды карыстаюся гэтым прыёмам. Яны пачынаюць абмяркоўваць праблему, думаць разам. Гэта павышае якасць навучання і нясе дадатковы матывацыйны эфект. У тым ліку для работы ў камандзе. Не сакрэт, што сёння многія фірмы, якія з'яўляюцца спажыўцамі праграмнага прадукту, аддаюць перавагу тым, хто ўмее працаваць разам. Яны, дарэчы, і арганізоўваюць многія камандныя спаборніцтвы па праграмаванні. А ўсё таму, што сёння ніякія сучасныя задачы ў адзіночку не вырашаюцца. Каб працаваць у калектыве, патрэбны адпаведныя навыкі. Трэба ўмець слухаць, разумець іншага чалавека, размяркоўваць час, ставіць пытанні... Камандныя алімпіяды дазваляюць атрымаць такі навык калектыўнай работы.

Міхаіл Сямёнавіч сцвярджае, што практычна з кожнага вучня можна зрабіць праграміста. Але ж толькі амбіцыі бацькоў, якія жадаюць бачыць сваё дзіця спецыялістам у высокааплатнай сферы, наўрад ці дапамогуць. Сам нашчадак павінен не толькі мець жаданне, але і настойліва самастойна працаваць:

— Ёсць некалькі кірункаў, якім чынам мы развіваем дзяцей. Першае — гэта мысленне. Другі — матэматыка. Самі матэматычныя веды карысныя для вырашэння праграмісцкіх задач. Трэці кірунак — праграмаванне непасрэдна. Прынцыпова важным з'яўляецца дыферэнцаванае аўтаматычнае навучанне. Наша сістэма пабудавана так, што яна вядзе кожнага вучня персанальна. Яму выдаецца задача. Калі ён можа яе зрабіць — робіць. Калі не — націскае кнопку —«не ведаю». І яму будзе дадзена сістэма заданняў, якія падвядуць яго да выканання той задачы, якую ён не змог зрабіць першапачаткова. Атрымліваецца, што кожнае дзіця можа займацца самастойна, а настаўнік працуе франтальна. Яго задача — арганізаваць працэс. Каб дзеці не перашкаджалі адно аднаму, думалі, стараліся, самастойна рабілі. У некаторых выпадках трэба і дапамагчы. Але, калі прыйшлося дапамагаць камусьці, для мяне гэта сігнал — у гэтым месцы сістэма дрэнна працуе. Трэба паставіць там заданне, каб не было патрэбы дапамагаць.

Каб стымуляваць работу школьнікаў дома, расказвае Міхаіл Далінскі, пастаянна праводзяцца конкурсы. Напрыклад, сезонныя — хто больш за ўсіх рашыць задач?

— Мы праводзім спаборніцтвы па праграмаванні і па матэматыцы. Таблічка на сайце аўтаматычна абнаўляецца, можна бачыць, хто колькі задач рашыў. Кагосьці такая сістэма стымулюе да новых вяршынь, але прынцыпова праблема матывацыі ўсё ж не вырашана. Не ўсе, каму цікава на занятках, дома гэтым займаюцца. А калі б вучні, як Гена Караткевіч, штотыдзень 20 гадзін аддавалі праграмаванню, былі б і вынікі больш высокія. Ну а паколькі я не ведаю, як яшчэ матываваць вучняў на працу, можна зрабіць спробу і павялічыць час заняткаў з імі. Пачынаць займацца гэтай справай трэба не з 9 класа, як раней усе пачыналі, а з першага. Тады, магчыма, хопіць часу, каб нечага большага дасягнуць.

У Гомелі працуюць філіялы многіх замежных фірмаў, і нашы вучні пасля заканчэння ВНУ ўладкоўваюцца менавіта туды. Большая частка з іх тут, на Беларусі, працягвае жыць, працаваць і зарабляць неблагія грошы. Дзяржава, між іншым, атрымлівае падаткі. Здаецца, праблемы ўцечкі мазгоў сярод праграмістаў у нашай краіне няма. Прывяду прыклад: Арцём Кузняцоў, першы гамяльчанін, які стаў чэмпіёнам рэспублікі ў 1997 годзе, на пэўны час з'ехаў у Маскву займацца мабільным банкінгам. Хутка стаў там кіраўніком аддзела, пасля чаго аддзел перавёў у Гомель. Дарэчы, Арцём быў першым распрацоўшчыкам сістэмы дыстанцыйнага навучання.

Сёння многія бацькі цярпяць ад таго, што іх дзеці маюць стасункі толькі з тэхнікай і не ўяўляюць сабе іншага ладу жыцця. Міхаіл Далінскі згаджаецца, але падкрэслівае: не камп'ютар псуе дзяцей, а тое, што ў сучасным свеце змянілася сістэма каштоўнасцяў. Грамадства стала спажывецкім, і ў многіх адна мэта — любымі спосабамі мець рэчы модныя, дарагія, прэстыжныя...

✓ «Праграмаванне можна назваць сацыяльнай лесвіцай, якую трэба прайсці сваімі нагамі, каб узлезці на пэўную вышыню. Але ж для гэтага трэба вельмі многа працаваць».

— Праблема не ў тым, што з'явіліся камп'ютары, а ў тым, што памянялася жыццёвая ўстаноўка: цяпер важна, што ты з'еў, што апрануў, а не колькасць кніг, якія прачытаў. Цяпер дзяцей зацягваюць не толькі гульні, але і сацыяльныя сеткі, дзе адбываецца імітацыя рэальнага жыцця. Адзіны спосаб, які я ведаю, каб вырваць дзяцей з віртуальнага свету — навучыць іх нейкай рэальнай справе. Камп'ютарная залежнасць з'яўляецца звычайна ў гульні, дзе прысутнічаюць моцныя эмоцыі. У нас на занятках дзеці разважаюць, стамляюцца і адпачываюць. Яны рана разумеюць, што, калі жадаеш чагосьці дасягнуць, на гульні часу не будзе. Вось менавіта таму я парэкамендаваў бы бацькам рабіць так, каб іх дзеці больш працавалі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

iost@zviazda.by

Фота аўтара

ТАЛЕНТЫ ЗАСТАЮЦЦА НА РАДЗІМЕ

Рэалізоўваць сябе і рабіць адкрыцці

2015 год, аб'яўлены ў Беларусі Годам моладзі, супаў з 20-годдзем існавання спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. З дня стварэння фонду стыпендыямі заахвочана больш як 30 000 навучэнцаў, студэнтаў і навуковых работнікаў. Фінансавая падтрымка аказана 104 інтэлектуальным і творчым аб'яднанням навучэнцаў і студэнтаў, якія дасягнулі найлепшых вынікаў у навукова-даследчай працы. З года ў год расце колькасць талентаў і павялічваецца іх дзяржаўная падтрымка. У 2015 годзе на ўзнагароджванне адораных юнакоў і дзяўчат фонду выдаткавана каля 7 млрд рублёў.

Несумненна, у Беларусі шмат талентаў, аднак, акрамя адоранасці, патрэбна жаданне развіваць яе, дасягаць новага і, вядома, падтрымка тых, хто побач. Дзякуючы такім складнікам можна рэалізаваць сябе як сапраўднага майстра і заслужыць пашану дзяржавы, стаўшы стыпендыятам фонду, адзначаюць яго прадстаўнікі.

ПАВОДЗІНЫ ТАКСАМА ЎЛІЧАЦЬ

Увогуле, мэтай заснавання фонду было стварэнне ўмоў для рэалізацыі талентаў беларускай моладзі на Радзіме, і, як паказвае практыка, задума сябе апраўдала. Каля 50% маладых талентаў абралі сферай дзейнасці навуку і адукацыю. 251 спецыяліст з ліку адоранай моладзі займае сёння кіруючую пасаду. Узрастае колькасць навуковых дасягненняў стыпендыятаў фонду. У 2014 годзе яны абаранілі 72 кандыдацкія і 1 доктарскую дысертацыі (у 2011-м — 47 дысертацый, у 2012-м — 50).

Каб стаць найбольш яркімі іскрынкамі, якіх заўважыць дзяржава, прэтэндэнты ў стыпендыяты павінны быць не толькі разумнымі, але і ўзорнымі. Перамагаць у міжнародных рэспубліканскіх алімпіядах (конкурсах, турнірах і іншых спаборніцтвах) па навучальных прадметах; мець асаблівыя поспехі ў навукова-даследчай, творчай, інтэлектуальнай дзейнасці і прыкладныя паводзіны.

Не застаюцца без увагі і педагогі, якія разгледзелі талент у сваіх выхаванцах і дапамаглі ім рэалізавацца. Так што ў тым, каб крочыць няпростым шляхам дасягненняў, пераадольваючы ўсе цяжкасці, зноў і зноў даказваючы свае здольнасці, зацікаўлены абодва бакі: і талент, і яго апякун, якія разам могуць скарыць вяршыні. За 19 гадоў прэміравана 2846 выкладчыкаў і навуковых работнікаў за асабісты ўклад у распрацоўку новай, больш эфектыўнай сістэмы адукацыі, сучасных методык развіцця адоранай моладзі, адзначылі ў фондзе.

АДКАЗНАСЦЬ ЗА КОЖНАГА, ДАПАМОГА — УСІМ

У 2005 годзе Прэзідэнт Беларусі ініцыяваў стварэнне банка даных адоранай моладзі, каб забяспечыць эфектыўнае выкарыстанне інтэлектуальнага патэнцыялу талентаў і аказаць дапамогу ў іх прафесійным станаўленні.

Трапіць у банк могуць не толькі стыпендыяты фонду. Імёны беларусаў, якія занялі прызавыя (I, II, III) месцы ў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіядах, або тых, за якіх

✓ Пераможцам міжнародных інтэлектуальных спаборніцтваў прысуджаецца ад 20 да 55 базавых велічынь (ад 3 млн 600 тыс. руб. да 9 млн 900 тыс.)

хадайнічае арганізацыя, дзе вучыцца ці працуе таленавітая асоба, па рашэнні Міністэрства адукацыі таксама могуць быць уключаны ў спісы банка. Сюды ж трапляюць кіраўнікі і члены кіруючых органаў рэспубліканскіх маладзёжных і дзіцячых аб'яднанняў.

Маладыя людзі, чые імёны ўнесены ў банкі даных адораных і таленавітых, адчуваюць рэальную дапамогу дзяржавы і падчас навучання, і пасля атрымання адукацыі. Так, яны маюць права на пазачарговае атрыманне жылля ў інтэрнаце на перыяд вучобы і першачарговае размеркаванне пасля яе.

Указам Прэзідэнта №273 «Аб павышэнні заробку некаторым катэгорыям маладых спецыялістаў» прадугледжана павышэнне на 50% тарыфных ставак асобам, што ўваходзяць у банк даных, у перыяд іх навучання ў ВНУ і працаўладкаваных у арганізацыі, якія фінансуюцца з бюджэту. Таксама яны могуць атрымаць ільготны крэдыт на будаўніцтва, рэканструкцыю ці куплю жылля.

«СІНЯЯ ПТУШКА»

Вельмі актыўна шукае таленавітую моладзь і далучае яе да ўдзелу ў жыцці краіны Міністэрства адукацыі. Летась было заахвочана 2316 навучэнцаў, студэнтаў, педагагічных работнікаў і сем навуковых, інтэлектуальных і творчых аб'яднанняў навучэнцаў на агульную суму 5 380 000 тыс. рублёў.

У 2008 г. па ініцыятыве і на сродкі заснавальніка фонду, лаўрэата Нобелеўскай прэміі Жарэса Алфёрава, нашага земляка, створаны Міжнародны Алфёраўскі фонд падтрымкі адукацыі і навукі. Для фінансавай падтрымкі адоранай моладзі з мінулага года ААТ «Хоум Крэдыт Банк» сумесна з Міністэрствам адукацыі і Беларускім саюзам жанчын рэалізуе праграму «Сіняя птушка». Згодна з новай ідэяй прадугледжваецца выдзяленне стыпендый на ўвесь перыяд навучання ў ВНУ, пачынаючы з першага курса, адораным студэнтам з малазабяспечаных ці няпоўных сем'яў, а таксама дзецям-сіротам, якія засталіся без бацькоўскай апекі. Зараз такую падтрымку атрымліваюць 10 студэнтаў — відавочна, што бізнес мог бы больш актыўна далучацца да стварэння сацыяльных праектаў па падтрымцы адоранай і таленавітай моладзі.

Намаганняў у гэтым кірунку не можа быць зашмат. Відавочна, што нам трэба ствараць сістэму сказнога суправаджэння таленавітай моладзі ад школьнай парты да працоўнага месца.

Ірына СІДАРОК

■ Добрая навіна

Сучасна, бяспечна і дакладна

Ваўкавыская цэнтральная раённая бальніца за сродкі з рэспубліканскага бюджэту (17,6 мільярда рублёў) аснасцілася камп'ютарным тамографам.

Такім чынам, гэтыя высокадакладныя дыягнастычныя апараты, з дапамогай якіх можна даследаваць практычна любы орган чалавечага арганізма, сёння ёсць ужо ва ўсіх буйных райцэнтрах Гродзеншчыны. Прычым яны працуюць і ў інтарэсах суседніх рэгіёнаў.

Напрыклад, магчымасцямі камп'ютарнай тамаграфіі ў Ваўкавыску скарыстаюцца жыхары не толькі гэтага, але і бліжэйшых Бераставіцкага, Зэльвенскага і Свіслацкага раёнаў. Дыягностыка, якая ў залежнасці ад органа і мэты абследавання займае ад 30 да 50 хвілін, па прызначэнні ўрача праводзіцца бясплатна. І практычна адразу ж пасля абследавання вядомы яго вынік.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■ З першых вуснаў

Аўбекір КАРКМАЗАЎ:

«ВАША КРАІНА ЎРАЗІЛА СВАЁЙ ПРЫГАЖОСЦЮ І ЎЛАДКАВАНАСЦЮ»

Прадстаўнікі дэлегацыі з Карачаева-Чаркесіі ехалі ў нашу краіну ўпэўненымі ў тым, што іх добразычлівы намер знойдзе водгук. Да каўказскіх гор ужо даўно дайшла добрая слава пра адну з найбольш паспяховых краін постсавецкай прасторы. Да таго ж, нашы землі аб'ядноўвае памяць аб сумесным удзеле ў разгроме ворага ў гады адной з самых крывавых войнаў, якія толькі ведала чалавецтва. 70-годдзе Вялікай Перамогі стала нагодай успомніць сыноў Карачая, чый подзвіг шануе гераічная Беларусь. Напярэдадні знамянальнай падзеі дэлегацыя рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Карачаеўцы — аланскі народ» наведала Беларусь. Нядаўна госці з Паўночнага Каўказа прыязджалі да нас зноў. Пра стаўленне да гістарычнага мінулага і магчымыя шляхі далейшага супрацоўніцтва распавёў кіраўнік дэлегацыі Аўбекір КАРКМАЗАЎ.

— Аўбекір Бійсултанавіч, найперш давайце ўзгадаем імёны вашых зямлякоў — тых, хто ваяваў за беларускую зямлю як за родную.

— У архівах вашай краіны захоўваюцца звесткі пра тое, што маленькая Карачаеўская вобласць дала для Беларусі шэсць камандзіраў партызанскіх брыгад, палкоў і атрадаў, групу афіцэраў-штабістаў, 14 камандзіраў рот, узводаў, больш за 30 камандзіраў дывер-сійна-разведчых груп, дзясяткі камандзіраў аддзяленняў, байцоў. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка, ацэньваючы подзвіг нашых землякоў, сказаў, што ў Беларусі памятаюць па імёнах гераічных сыноў Карачая, якія мужна змагаліся з ворагам. Навечна ў памяці народнай застануцца легендарныя подзвігі Асмана Касаева, Кічыбатыра Хаіркізава, Юнуса Капракетава і соцень іх баявых сяброў, якія аддалі свае жыцці ў барацьбе за свабоду Савецкай Беларусі.

Паўсюдна, дзе б мы ні былі, нас сустракалі сардэчна і гасцінна, як добрых сяброў. Уражвала тое, як у вас дагледжаны помнікі, воінскія пахаванні. Мы былі відавочцамі таго, як да іх у парадных касцюмах разам з унукамі, праўнукамі ішлі ветэраны. Яны ўскладвалі кветкі, у тым ліку і да магіл нашых землякоў.

Куды б мы ні звярталіся: у Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, у Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, у Брэсцкі абласны краязнаўчы музей, у раённыя музеі, сельскія клубы, бібліятэкі — нам не толькі прадастаўлялі архіўныя даныя, але і дапамагалі ў пошуку любой інфармацыі. Зацікаўленае стаўленне да мэты нашага візіту атрымалі і ў Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь.

Дзякуючы такой адкрытасці і падтрымцы ўдалося даведацца шмат новага пра патрыётаў Карачая, прасякнуцца яшчэ большай павагай да беларускага народа, які бераліва захоўвае памяць пра тых, хто абараняў нашу агульную на той час Радзіму.

— Вядома, што ў вашым горным краі падрастаюць блакітныя елкі, якія могуць стаць жывым помнікам у Беларусі...

— Удзельнікі нашай дэлегацыі напярэдадні 9 Мая на тэрыторыі ваенна-гістарычнага комплексу Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Станькаве прынялі ўдзел у закладцы алеі ў гонар герояў Вялікай Перамогі.

Зараз мы звярнуліся ў Мінскі гарвыканкам з прапановай разгледзець пытанне аб магчымасці стварэння на тэрыторыі парку Перамогі ў Мінску алеі з 70 каўказскіх блакітных елак — у памяць аб карачаеўцах, якія загінулі за незалежнасць Беларусі. Алею прапаноўваем закласці сёлета да канца года. Яна стане своеасаблівым сімвалам двух братэрскіх народаў і будзе служыць моладзі напамінам пра каштоўнасць міру і важнасць жыцця ў згодзе.

— Вы прыехалі ў Беларусь з ужо распрацаваным праектам манументальнага мемарыяла. У чым яго сутнасць?

— У мемарыяле адлюстраваны подзвіг нашых народаў. Ён сведчыць пра тое, што супрацьстаяць такому магутнаму ворагу мы маглі толькі разам.

Цэнтральны сімвал манумента — вобраз беларускай жанчыны. Многіх нашых змагароў выратавалі ад вернай смерці пасля раненняў высакародныя жанчыны Беларусі. Кранаюць вось такія ваенныя гісторыі.

Асман Касаеў сустрэў вайну начальнікам артылерыі 383-га стралковага палка 121-й стралковай дывізіі. Дайшоўшы да Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці, дывізія трапіла ў акружэнне і была разгромлена ў жніўні 1941 года. Група байцоў і камандзіраў, сярод якіх знаходзіўся і Асман Касаеў, прыняла рашэнне пачаць баявыя дзеянні ў якасці партызанаў. Пасля цяжкага ранення Асмана Касаева выхадзіла Фёкла Навумаўна — ён называў жанчыну другой маці. Легендарны полк пад камандаваннем Асмана Касаева вызваліў 44 населеныя пункты Бялыніцкага, Магілёўскага раёнаў, якія з 1941 па 1944 год фактычна знаходзіліся пад аховай партызанаў.

Камандзір дэсантнай роты танкавай дывізіі Аскер Бархозаў сустрэў вайну пад Пружанамі. У жніўні ён прыняў стралковы батальён. Два месяцы адбіваючы ворага, батальён адыходзіў з баямі. 30 верасня 1941 года Аскер Бархозаў з афіцэраў застаўся адзін. Цяжкапараненага камандзіра салдаты на руках данеслі да вёскі Маісееўка Буда-Кашалёўскага раёна. Мясцовая жанчына выхадзіла Аскера з дапамогай лекаў, здабытых яго землякамі. Наступны раз параненага, беспрытомнага Бархозава пад варожым абстрэлам вынесла адважная партызанка Аляксандра Сільчанка. Яна перадала камандзіра ў сям'ю Дзергачовых у вёсцы Дзедава суседняга Быхаўскага раёна. Лідзія Мікалаеўна Дзергачова з дапамогай малодшага брата Мікалая выхадзіла яго.

Гэтую чалавечую прыязнасць мы і хочам уславіць ў помніку. Чакаем прыняцця мінскімі гарадскімі ўладамі рашэння аб месце ўзвядзення манумента.

— Як вядома, ініцыятыву вашай грамадскай арганізацыі ахвотна падтрымалі ў Карачаева-Чаркесіі...

— Даведаўшыся пра мэты нашай паездкі, адгукнуўся і дапамог маральна і матэрыяльна кадзій Духоўнага кіраўніцтва мусульман КЧР Ібрагім-хаджы Катчыеў. Нашымі аднадумцамі сталі многія паважаныя людзі і дэпутаты парламента КЧР. Мастакі Мустафа Кіпкееў, Кемал Таушунаеў, Казбек Французаў перадалі беларусам у дар свае карціны. Неацэнную дапамогу падчас паездкі па месцах баявой славы партызанаў-карачаеўцаў аказалі палкоўнік у адстаўцы Качубееўскага раёна Стаўрапольскага края Пётр Корнеў і яго брат Аляксандр, які жыве ў Гомельскай вобласці. У склад дэлегацыі ўвайшлі мастак Казбек Французаў і Айса Эркенаў, які дваццаць пяць гадоў жыў у Беларусі. Ён узяў на сябе асноўную нагрузку па арганізацыйных пытаннях. Мы прапануем яго кандыдатуру на ролю кіраўніка грамадскай арганізацыі Карачаеўскай дыяспары ў Рэспубліцы Беларусь «Карачаеўцы — аланскі народ».

— Сапраўды, у Беларусі актывізаваўся працэс стварэння гэтай грамадскай арганізацыі. Што ў яе планах?

— Беларусь захапіла нас сваёй рукатворнай і нерукатворнай прыгажосцю, уладкаванасцю. У вашай краіне ўсё гарманічна, таму хочацца пераймаць яе вопыт. У прыватнасці, вялікую цікавасць маем да сельскай гаспадаркі. У Беларусі пераважна буйныя гаспадаркі. У нас, каб замацаваць людзей на сяле, развіваюцца сялянска-фермерскія і асабістыя падсобныя гаспадаркі. Сяло з'яўляецца носьбітам самабытнай культуры, традыцый народа. Распрацаваны праект вучэбна-вытворчага аграбізнес-інкубатара для фарміравання першапачатковага капіталу. Для стварэння дадатковых працоўных месцаў распрацаваны праект «Цэнтр гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны народаў рэгіёна», дзе народныя майстры могуць паказаць свае здольнасці.

Нашы дзверы заўсёды адчынены для гасцей. Убачыць Каўказ, яго велічныя горы і самую высокую вяршыню Еўропы, Эльбрус, — гэта ўражанне на ўсё жыццё для любога чалавека.

Радуе тое, што і ў Беларусі ў нас ёсць аднадумцы. Калі ў праграме грамадскай арганізацыі «Карачаеўцы — аланскі народ» гаворыцца аб імкненні да дабрабыту, прагрэсу, сапраўднага раўнапраўя, то гэта не проста гучныя словы. Гэта заклік да сучаснага, часам вельмі супярэчлівага свету — аб'ядноўвацца!

Алена СТЭЛЬМАХ

■ Настаўніцкі шлях

ДРУГІ РАЗ У «ПЕРШЫ» КЛАС

Штрыхі да «партрэта» школы, дзе хочацца не толькі вучыцца, але і выкладаць

У мінулым выпуску «Жыві і квітней, Беларусь!» рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка Аляксандр ЖУК зазначыў, што ў краіне ёсць школы, дзе педагагічны калектыў амаль напалову складаецца са сваіх выпускнікоў, і ў якасці прыкладу прывёў Ашмянскую СШ №1. За апошнія 5 гадоў 50 выпускнікоў школы сталі студэнтамі педагагічных навучальных устаноў, прычым 31 з іх паступілі па мэтавым накіраванні. Карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся ў яе дырэктара, заслужанага настаўніка Беларусі Міхаіла ГРУЖЭЎСКАГА, як жа ва ўстанове адукацыі фарміруюць павагу да настаўніцкай прафесіі і чаму маладыя спецыялісты, адпрацаваўшы пасля ВНУ абавязковы тэрмін, застаюцца там і надалей.

ЦІКАВЫМ ІНІЦЫЯТЫВАМ — «ЗЯЛЁНАЯ ВУЛІЦА»

Міхаіл Мар'янавіч на Ашмяншчыне тутэйшы, ураджэнец вёскі Каменка. Скончыў там васьмігадовую школу і па сёння з удзячнасцю ўзгадвае сваіх настаўнікаў — Аляксандру Трафімаўну Карсакову, Ганну Макараўну Кашчыц, Валянціну Мікалаеўну Фурсу, Таццяну Цітаўну Шынкевіч, Валянціна Гаўрылавіча Гана і Ефрасінню Максімаўну Ган.

— У 1960-1970-я гады ў нашай вёсцы людзі, вітаючыся, здымалі шапкі. Прычым, калі віталіся з настаўнікам, то шапку здымалі здалёк. Вось які быў аўтарытэт! — прыгадвае Міхаіл Мар'янавіч.

Як прывіць павагу да настаўніцкай працы цяпер? Міхаіл Гружэўскі лічыць, што мала стварыць педагагічныя класы. Педагагічнай, так бы мовіць, павінна быць уся школа. Каб было цікава дзецям, камфортна бацькам, хацелася творча працаваць настаўнікам. І ўсіх яднала пачуццё гонару за родную школу:

— Калі кожны настаўнік на кожным кроку 11 гадоў будзе ўспрымацца вучнямі як паспяховы чалавек у жыцці і прафесіі, фарміраваць адзіную пазіцыю годнасці і самаадданасці сваёй працы, не ныць, не скардзіцца вучням на цяжкасці, не адбіваць ахвоту ад гэтай прафесіі, а заклікаць у яе сваёй эрудыцыяй, то гэта і прывядзе да педагагічнай школы, і выпускнікі стануць на настаўніцкі шлях, — лічыць Міхаіл Гружэўскі. — А калі гэтага няма, калі на ўроках з году ў год гучыць негатыў аб прафесіі, а часам і адкрытыя заклікі «Не ідзі ў настаўнікі, гэта цяжкая, нецікавая, няўдзячная прафесія», такі «настаўнік» не мае права працаваць у школе. Ідзі і змяні прафесію, не калеч дзяцей, а магчыма, і будучыню грамадства.

Цікавым ініцыятывам у калектыве Ашмянскай СШ №1 заўсёды «зялёная вуліца». Нядаўна, напрыклад, абвясцілі тры конкурсы («Калядная зорка», «Патрыёт.by» і «Жарт») для аматараў сучасных мультымедыйных тэхналогій. У прыватнасці, з дапамогай любога праграмнага забеспячэння прапанавалі стварыць камп'ютарную гульню, прысвечаную гераізму беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, нашай гісторыка-культурнай спадчыне і традыцыям. Дарэчы, амаль усе педагогі маюць сертыфікаты IT-карыстальнікаў, паспяхова ўдзельнічаюць у рэспубліканскім конкурсе «Камп'ютар. Адукацыя. Інтэрнэт», школа развівае дыстанцыйнае навучанне Moodle. У гэтым навучальным годзе ўвялі электронныя журналы і дзённікі, і цяпер бацькі могуць аператыўна адсочваць паспяховасць сваіх дзяцей.

На імідж школы, жаданне там вучыцца і выкладаць уплывае не толькі выкарыстанне сучасных камп'ютарных, адукацыйных тэхналогій, але і... звычайная прышкольная тэрыторыя. Яна можа стаць дзівосным прыродным кутком, куды прыязджаюць на фотасесіі нават з іншых раёнаў.

Дэпутат парламента Наталля Кучынская і дырэктар Ашмянскай СШ №1Міхаіл Гружэўскі разам з вучнямі і работнікамі лясніцтва ўдзельнічалі ў акцыі «Пасадзім лес Перамогі!» у гонар 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

І ПРАЦАВАЦЬ, І ЗАРАБЛЯЦЬ

— Разам генеруюць ідэі і сумесна іх ажыццяўляем, нават першакласнікі далучаюцца. А калі нешта зрабіў, упрыгожыў сваімі рукамі, то не будзеш гэта ламаць, смеціць, — кажа Міхаіл Мар'янавіч.

Пры гэтым не затрацілі ніводнага бюджэтнага рубля. Дапамагалі сельгаспрадпрыемствам — сабранае на палях каменне прывозілі на школьны двор, каб выкарыстаць у паркавым будаўніцтве.

Працавалі ў лясніцтве — лесаводы разлічыліся драўнінай, з якой вырабілі і ўстанавілі на школьнай тэрыторыі лаўкі. Ды і саджанцы былі не падарункам школе, а за работу.

Такім чынам дзеці вучацца працаваць і разам з тым зарабляць. Адной з крыніц школьных даходаў, акрамя платных адукацыйных паслуг, здачы металалому і макулатуры, з'яўляюцца канцэрты трох уласных узорных калектываў — фальклорнага тэатра песні і танца «Званочкі», эстраднай студыі «Палёт» і тэатра танца «Эфект». Прывучаюць і да таго, што за атрыманыя паслугі трэба плаціць. Зноў жа, у агульных інтарэсах. Напрыклад, кошт білета на школьную дыскатэку невялікі, але ў цэлым ідзе назапашванне сродкаў, якія накіроўваюцца і на развіццё дыскатэчнай базы.

— Мне гэтая школа адразу спадабалася. Тут працуюць сапраўдныя прафесіяналы, якія творча ставяцца да настаўніцкай працы. У калектыве мяне прыязна сустрэлі, аказалі ўсялякую падтрымку. Таму пакаваць чамаданы пасля абавязковага тэрміну работы па размеркаванні не збіраюся, — кажа **сацыяльны педагог, выпускніца Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Настасся ГРЫБОЎСКАЯ.**

Маладому спецыялісту дапамаглі ў тым ліку і ў бытавых пытаннях. Ашмянская СШ №1 была адной з першых, дзе, згодна з калектыўным дагаворам, за кошт фонду матэрыяльнага стымулявання кампенсуюць настаўнікам частку расходаў па пражыванні на здымнай кватэры ці ў інтэрнаце.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by
г. Ашмяны

У ТЭМУ

Аддзел адукацыі Ашмянскага райвыканкама і ГрДУ імя Янкі Купалы заключылі дагавор аб супрацоўніцтве. СШ №1 і іншыя навучальныя ўстановы прадастаўляюць, так бы мовіць, пляцоўку для прафарыентацыйных мерапрыемстваў, а ВНУ дапамагае ім у метадычным суправаджэнні педагогаў, падрыхтоўцы вучняў да прадметных алімпіяд.

Школа і наогул раён супрацоўнічаюць і з БДПУ імя М. Танка. Дзякуючы ранейшаму начальніку аддзела адукацыі, а цяпер дэпутату, намесніку старшыні пастаяннай камісіі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры і навуцы Наталлі Кучынскай «зорныя паходы» гэтай установы знайшлі штогадовую прапіску на Ашмяншчыне.

ЧЭМПІЁНСКІ ЎЗРОВЕНЬ

Як на невялічкай рачулцы «куюць» сапраўдных чэмпіёнаў

Яшчэ ў савецкія часы невялічкі горад Жодзіна славіўся на ўсю краіну не толькі сваімі «БелАЗамі», але і выдатнай спартыўнай школай веславання на байдарках і каноэ. Тут, на вадасховішчы цеплаэлектрацэнтралі, свае першыя спробы пад наглядам трэнераў рабілі вядомыя Мікалай Астапковіч, Уладзімір Тайнікаў, Валерый Чамеза — спартсмены, якім было наканавана стаць чэмпіёнамі, прызёрамі міжнародных спаборніцтваў. Якімі праблемамі жыве вядомая школа сёння? Чым яна можа пахваліцца? Колькі дзяцей займаюцца веславаннем? З гэтымі пытаннямі карэспандэнт «Звязды» і адправіўся ў сталіцу беларускага машынабудавання.

Фота Дзіяны ЛІХАЧОВАЙ.

НА ЎЗДЫМЕ

— Гадоў 15 нашы выхаванцы не заваёўвалі значных узнагарод, але сёння школа зноў на ўздыме, — кажа **Валерый Смольскі, намеснік дырэктара школы.** — Ірына Ганчук (Памелава) у складзе байдаркі-чацвёркі стала бронзавай прызёркай Алімпіяды ў Лондане. Упершыню наша выхаванка здабыла алімпійскі медаль! За падрыхтоўку Іры абласное ўпраўленне спорту і турызму перадала нам сем трэнажораў і адну байдарку. Аляксандра Грышына, яшчэ адна наша дзяўчынка, таксама выступае за зборную краіны і з'яўляецца кандыдаткай на ўдзел у Гульнях у Рыа-дэ-Жанейра. Два гады запар яна становіцца сярэбраным прызёрам чэмпіянату свету. Не хочацца сурочыць, але ў Сашы вялікі патэнцыял. Цяпер ідуць размовы аб тым, што ў наступныя Алімпійскія гульні, магчыма, уключаць новую дысцыпліну — жаночае каноэ. У гэтых спаборніцтвах наша выхаванка Вольга Клімава нядаўна стала пераможцай маладзёжнага чэмпіянату Еўропы. Акрамя іх, у нас таксама хапае моладзі, якая можа ў будучыні дасягнуць добрых вынікаў. Колькі яшчэ гэты ўсплёск будзе працягвацца, не ведаем. Але працуем на перспектыву і імкнёмся да таго, каб у нас з'яўлялася як мага больш здольных спартсменаў.

— Аднак сёння вы можаце пахваліцца не толькі добрымі вынікамі, але і добраўпрадкаванай школай.

— Будынак школы адрэстаўравалі. Яна стала больш утульнай, цёплай. А дагэтуль, калі вяліся рамонтныя работы, нашы дзеці наогул пераадзяваліся ў пераабсталяваным халодным вагончыку. Што тычыцца іншых змен, нам на баланс перадалі гульнявую пляцоўку, якую пабудавала федэрацыя футбола сумесна з гарадскімі ўладамі. І мы ёй актыўна карыстаемся. Наша галоўная праблема — інвентар. Ён усё ж такі каштуе дорага. За невялічкія грошы якасныя лодкі набыць складана.

— У самой назве ўстановы — школа алімпійскага рэзерву — закладзена галоўная мэта. Ці часта жодзінскія весляры пераходзяць ад вас у абласныя і рэспубліканскія вучылішчы алімпійскага рэзерву?

— Амаль кожны год. Сёлета трое спартсменаў пайшлі на павышэнне. Трэніруюцца цяпер у барысаўскім філіяле плешчаніцкага вучылішча алімпійскага рэзерву. Яны жывуць у інтэрнаце, вучацца ў Барысаве і паралельна трэніруюцца на Бярэзіне.

— Жодзіна — горад не самы вялікі. І веславанне тут далёка не папулярны від спорту. Ці адчуваеце інтарэс сярод дзяцей?

— Акрамя веславання, у Жодзіне развіваюць футбол, самба, дзюдо, цяжкую атлетыку. Нядаўна ў горадзе адкрылі лядовы каток, і ў перспектыве плануюць выдаткаваць дзве стаўкі для трэнераў па хакеі. З наборам нам сапраўды стала цяжкавата. Увогуле веславаннем на байдарках і каноэ ў Жодзіне сёння займаюцца 240 чалавек, з якімі працуюць 8 трэнераў.

— Акрамя падрыхтоўкі спартсменаў, вы, калі не памыляюся, штогод праводзіце мемарыял Мікалая Астапковіча...

— Мікалай памёр у 1999 годзе, і спаборніцтвы, прысвечаныя яму, мы пачалі праводзіць праз два гады. Спачатку на вадасховішчы збіраліся людзі, якія асабіста яго ведалі, ветэраны, спаборнічалі паміж сабой. Паступова падключылі моладзь — і спаборніцтвы сталі маштабнымі. Сёлета ў іх удзельнічалі звыш 140 маладых спартсменаў. На адкрыцці турніру сабраліся ўсе нашы славутыя выхаванцы. Дарэчы, спаборніцтвы супалі з юбілейнай датай. Роўна 50 гадоў таму Міхаіл Элімелах, першы трэнер Астапковіча, ганаровы жыхар горада Жодзіна, зрабіў дэбютны набор у школу веславання. Прысутнічаў на гонках і Георгій Жукоўскі, першы дырэктар школы, які ўзначальваў яе да 2001 года.

ЛЕПШАГА МЕСЦА НЕ ЗНАЙСЦІ

У асноўным трэнеры школы — мясцовыя спецыялісты, але ёсць сярод іх і «легіянеры». Напрыклад, Віталь Быкаў, які прыехаў працаваць у Жодзіна з Брэста, дзе функцыянуе адзін з найлепшых у Еўропе вяслярных каналаў.

— Пераехаў у Жодзіна па сваім жаданні, — кажа Віталь. — Адпрацаваў у Брэсце шэсць гадоў, паступіла прапанова пераехаць бліжэй да Мінска, і я пагадзіўся. Не шкадую. Умовы для працы тут добрыя, і пераязджаць у іншае месца я не планую. У бытавым пытанні таксама ніякіх праблем. Жыву ў інтэрнаце.

Шчыра кажучы, многія не могуць пахваліцца такімі дасягненнямі, якія ёсць у жодзінскай школы. У Жодзіне пачыналі шмат добрых мясцовых спартсменаў. І, як бачым, вынікі толькі паляпшаюцца.

— І як вам умовы пасля шыкоўнага брэсцкага канала?

— Для груп пачатковай падрыхтоўкі лепшага месца для трэніровак не знайсці. Вецер амаль адсутнічае. Штыль. Акваторыя добра праглядваецца. Маем катары для суправаджэння юных весляроў. Але галоўнае для нас — кемлівыя, здольныя дзеці, а каналы — справа другасная. Калі школа моцная, хопіць і невялічкага азярца.

— Веславанне ўжо гістарычна ўкаранілася ў Жодзіне, — далучаецца да размовы Аляксей Лукашэвіч, калега Віталя, які працуе ў школе ўжо 16 гадоў. — У нас ёсць дзеці, патэнцыял, з якім трэба працаваць. Веславанне было тут раней, і яно ў Жодзіне будзе надалей.

— А ці адчувае горад значнасць веславання?

— Безумоўна. Са старэйшага пакалення амаль кожны прайшоў праз школу, — працягвае Аляксей. — Жыхары памятаюць пра яе, не забываюцца. І ніхто вам не скажа, што ў Жодзіне веславання няма. У нас вельмі развіты ветэранскі рух. Так, рака ў нас не такая буйная. Але на ёй куюцца прызёры і чэмпіёны міжнародных спаборніцтваў.

Хочацца толькі пажадаць, каб так было і надалей.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

■ Перадсвяточнае

ЖАНЧЫНА — ЦУД,

а маці заслугоўвае глыбокай павагі і пакланення

Няма чалавека, раднейшага за маці. Ніякія скарбы не заменяць яе любові. Мацярынская малітва абароніць ад полымя і падыме са дна, яе заступніцтва і бласлаўленне ўратоўваюць дзяцей ад шматлікіх бед... Словы пашаны і ўдзячнасці гучалі гэтымі днямі ў сталічнай гімназіі №11 падчас урачыстага ўшанавання матуль, арганізаванага Беларускім саюзам жанчын (БСЖ) у рамках Тыдня маці.

Удзельнікі і пачэсныя госці свята ўшанавання маці: Таісія ПУЖЭВІЧ, Надзея ЕРМАКОВА і творчы калектыў "Лёсы" былых малалетніх вязняў канцлагераў.

Сімвалічна, што пачатак святочных мерапрыемстваў адбыўся менавіта ў Першамайскім раёне Мінска — менавіта тут у 1994 г. упершыню адзначаўся Дзень маці. Цяпер гэтая падзея заняла сваё пачэснае месца ў шэрагу іншых дзяржаўных свят Беларусі.

Выхаванцы гімназіі арганізавалі для матуль і запрошаных гасцей цудоўны канцэрт: яны спявалі, танцавалі, чыталі вершы і выконвалі гімнастычныя нумары. Напрыканцы свята перад прысутнымі выступіў творчы калектыў «Лёсы» былых малалетніх вязняў канцлагераў. Непадкупныя шчырасць і непасрэднасць выканаўцаў кранулі многія сэрцы, шмат хто не змог стрымаць слёз. Шчымлівыя, кранальныя словы гучалі і ад арганізатараў свята, і ад гасцей.

— У гімназіі стартавала акцыя пакланення жанчыне-маці, жанчыне-працаўніцы, чыімі стараннямі і цеплынёй саграваецца кожная сям'я. Жанчыны Беларусі, маці Беларусі заслугоўваюць глыбокай павагі, — сказала **Таісія ПУЖЭВІЧ, старшыня Першамайскай раённай арганізацыі БСЖ.**

Айцец СВЯТАСЛАЎ, старшыня хрысціянскага адукацыйнага цэнтра ў гонар святых Кірылы і Мяфодзія, закрануў духоўны складнік свята Дня маці:

— У царкоўных звычаях ёсць цудоўная традыцыя не толькі святкаваць нейкую падзею, але і праводзіць перадсвята — калі за некалькі дзён пачынаецца падрыхтоўка, якая праходзіць праз усё богаслужэнне. Сёння мы, самі таго не жадаючы, выконваем гэтую традыцыю. Дзень маці, які супадае са святам Пакрова Прасвятой Багародзіцы, яшчэ напярадзе, а мы адкрываем святкаванне такімі кранальнымі ўрачыстасцямі.

Намеснік старшыні БСЖ Надзея ЕРМАКОВА пажадала прысутным часцей усміхацца і ніколі не зведаць жахаў вайны.

— Спадзяюся, мы будзем жыць у свабоднай краіне і нашы сыны не будуць сыходзіць ваяваць. Я глядзела на выступоўцаў, і слёзы наварочваліся ад іх пяшчоты і шчырасці. На жаль, не ва ўсіх дзяцей ёсць мамы. Аднак з іншага боку, ёсць матулі, якія ўсынавілі дзетак, і, магчыма, яны заслугоўваюць нават большай павагі, чым некаторыя біялагічныя бацькі. Калі глядзіш у вочы малым у дзіцячых дамах, сэрца рвецца на кавалкі, бо відаць, як ім хочацца, каб у іх была мама, — сказала Надзея Андрэеўна.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара

Выхаванцы сталічнай гімназіі №11 дораць словы любові і падзякі ўсім матулям Беларусі.

Выстава твораў, зробленых рукамі навучэнцаў гімназіі.

■ Ёсць нагода

Культура для жыцця

Дзень работнікаў культуры, што адзначаецца заўтра (у другую нядзелю кастрычніка), добрая нагода падвесці вынікі. Да свята, дарэчы, спрычынныя як мінімум шэсцьдзесят тысяч чалавек — працаўнікоў адпаведных установ. Увогуле ж культуру краіны ўвасабляюць у сабе звыш сямі тысяч арганізацый.

...А гэта ў тым ліку 27 тэатраў, 97 кінатэатраў, 152 музеі, 2 цыркі, 18 канцэртных арганізацый, больш за 3200 клубных устаноў і каля трох тысяч бібліятэк, суцэльная сістэма прафесійна-мастацкай адукацыі — ад дзіцячых школ да ВНУ.

На сферу культуры сёлета запланавана выдаткаваць больш за чатыры трыльёны рублёў, а гэта на 600 мільярдаў больш, чым у 2014 годзе. «Культурныя арганізацыі імкнуцца і самі зарабляць грошы: за восем месяцаў гэтага года яны атрымалі пазабюджэтны даход у памеры каля 800 мільярдаў рублёў», — каментуе **першы намеснік міністра культуры Ірына ДРЫГА.** — Гэта не значыць, што дзяржава імкнецца перавесці ўстановы культуры на самаакупнасць. Падтрымка ёсць і застанецца асноўным падмуркам іх развіцця».

Падводзячы вынікі, можна сказаць, што ў гэтым годзе тэатрамі было пастаўлена больш за дзевяноста новых спектакляў, а ў сферы кінамастацтва было праведзена два рэспубліканскія конкурсы, створаны з дзяржпадтрымкай тры фільмы ў ігравой форме, чатыры ў неігравой, чатыры летапісныя сюжэты і сем анімацыйных карцін. Адзін з пераможцаў перадапошняга конкурсу кінапраектаў — стужка «Беларусь. Дакументальная гісторыя» Галіны Адамовіч — ужо была прадстаўлена гледачам.

Культура — гэта не толькі лічбы, але і людзі. Напярэдадні Дня работніка культуры шмат абмяркоўвалася непрыгожая схема перадачы сцэнарыя фільма «Сляды на вадзе» рэжысёра Андрэя Голубева (праект перамог на апошнім конкурсе Міністэрства культуры) іншаму (дарэчы, замежнаму) рэжысёру. Карыстаючыся момантам, мы папрасілі спадарыню Дрыгу пракаментаваць сітуацыю, і першы наменік міністра таксама адзначыла неабходнасць расставіць усе кропкі над «і»:

— У нас праводзіцца конкурс кінапраектаў, а сцэнарыі з'яўляюцца толькі іх складнікам. У конкурсе прыняла ўдзел і перамагла з праектам фільма «Сляды на вадзе» нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм», яна над будучым фільмам і працуе. Кандыдатура рэжысёра не зацвярджаецца на конкурсе, склад здымачнай групы, у тым ліку рэжысёра, вызначае сама кінакампанія — можна спасылацца і на Указ Прэзідэнта №567 «Аб мерах па дзяржаўнай падтрымцы і стымуляванні развіцця кінематаграфіі», і на пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь №174, якая вызначае парадак правядзення конкурсу. Кінастудыя адказвае за мастацкую якасць і прасоўванне будучага фільма, таму прыняла рашэнне, і мае на гэта права, аб прыцягненні іншага рэжысёра. На лёсе аўтара сцэнарыя гэта ніяк не адаб'ецца, аўтарскі ганарар будзе выплачаны. Мы, як Міністэрства культуры, не ўмешваемся ў справу вызначэння рэжысёра, а зацікаўлены толькі ў адным: каб быў зроблены высакаякасны праект, якім мы зможам ганарыцца.

Пераходзячы ад кінематографа да матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны, трэба адзначыць, што ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў на гэты момант уключана больш за пяць тысяч аб'ектаў. Прадстаўнікі міністэрства кажуць, што праца са спісам і тым, што за ім стаіць, вядзецца амаль кожны дзень. На дзесяці аб'ектах вядуцца будаўнічарэстаўрацыйныя работы, напрыклад, на кінастудыі «Беларусьфільм», Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку, Косаўскім палацава-паркавым ансамблі, музейным кварталe як комплексе Нацыянальнага мастацкага музея ды іншых аб'ектах.

Культура Беларусі ідзе таксама ў напрамку міжнароднага супрацоўніцтва. На гэты момант падпісана пагадненне паміж урадамі Кітая і Беларусі аб узаемным заснаванні культурных цэнтраў, падпісаны мемарандум аб узаемапаразуменні з урадам Аўстраліі аб супрацоўніцтве ў сферы мастацтва і культуры, пагадненне аб супрацоўніцтве з Міністэрствам інфармацыі, тэлерадыёвяшчання і нацыянальнай спадчыны Пакістана, праграма супрацоўніцтва з Міністэрствам культуры Расіі на 2015-2017 гады.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ
katsyalovich@zviazda.by

ЗНІЖКІ — УВЕСЬ МЕСЯЦ

Цягам кастрычніка мінскія ўнівермагі прапануюць пакупнікам зніжкі ў памеры 15-20 працэнтаў, аб гэтым паведамілі ў Галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.

Цягам усяго месяца ЦУМ прадастаўляе зніжку ў 15 працэнтаў на тэхніку. 13 і 27 кастрычніка ва ўнівермагу «Беларусь» пакупнікі змогуць атрымаць 20-працэнтную зніжку на ўсе тавары. У гандлёвым цэнтры «Кірмаш» кожную сераду месяца ўсіх, хто набывае нехарчовыя тавары, чакае зніжэнне цаны на 15 працэнтаў. А 13 кастрычніка такая ж зніжка на нехарчовыя тавары будзе арганізаваная для трымальнікаў дысконтных картак.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Извещение о проведении 04 ноября 2015 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Автомагистраль»

Предмет торгов №1
здание административно-хозяйственное (наименование – здание административно-производственного корпуса с инвентарным номером 420/С-1070) общей площадью 1573,3 кв. м; здание специализированное транспорта (наименование – здание гаражей с бойлерной, кузницей, складом с инвентарным номером 420/С-1071) общей площадью 385,8 кв. м; здание специализированное транспорта (наименование – здание гаражей со складом материалов с инвентарным номером 420/С-1072) общей площадью 1017,4 кв. м; здание многофункциональное (наименование – здание гаражей со столярным цехом, лабораторией, складом с инвентарным номером 420/С-1599) общей площадью 1032,6 кв. м; здание административно-хозяйственное (наименование – здание проходной с инвентарным номером 420/С-1600) общей площадью 126,4 кв. м; здание специализированное коммунального хозяйства (наименование – здание туалета с инвентарным номером 420/С-35883) общей площадью 12,2 кв. м; сооружение неустановленного назначения (наименование – сооружение благоустройства с инвентарным номером 420/С-44516) общей площадью 11936,1 кв. м; кран-балка (инв. № 041229); пресс гидравлический (инв. № 041202); станок вертикально-сверлильный ВСН-12 (инв. № 1031); станок настольный (инв. № 044341); станок токарный 1 м63 (инв. № 041677); два стеллажа изготовленных (инв. №№ 070869 и 070870); станок точильно-шлифовальный (инв. № 0124); автозаправочный блок-пункт АБП 00.00.000ПС (инв. № 020090); зеленые насаждения /ель, каштан, рябина, липа/ (инв. № 90022); комплектная трансформаторная подстанция 2 КТПТАС-В/К400/10/0,4-08У1 (инв. № 040088); станция контейнерная автозаправочная КА 33 (инв. № 020089); две топливораздаточные колонки (инв. №№ 020091 и 020092).
Площадь земельного участка – 1,9533 га, кадастровый номер 441300000090000041
Местонахождение – Гродненская область, Лидский район, г. Лида, ул. Мицкевича, 41 (д. 41; д. 41, корп. 1; д. 41, корп. 2; д. 41, корп. 3; д. 41, корп. 4; д. 41, корп. 5)
Начальная цена – 6 412 963 773 белорусских рубля с учетом НДС
Сумма задатка – 600 000 000 белорусских рублей
Обременение – аренда
Предмет торгов №2
здание административно-хозяйственное (наименование – здание бытовых помещений с котельной с инвентарным номером 420/С-35887) общей площадью 70,6 кв. м; здание административно-хозяйственное (наименование – здание бытового корпуса со складскими помещениями с инвентарным номером 420/С-36635) общей площадью 252,4 кв. м; сооружение неустановленного назначения (наименование – сооружение благоустройства объекта АБЗ ст. Гутно участок № 3 с инвентарным номером 420/С-47349) общей площадью 6456,88 кв. м; сооружение неустановленного назначения (наименование – сооружение благоустройства объекта АБЗ ст. Гутно участок № 4 с инвентарным номером 420/С-47350) общей площадью 2781,0 кв. м; агрегат минерального порошка ДС-185 (инв. № 042674); агрегат целлюлозной добавки (инв. № 042690); асфальтобетоносмеситель ДС-158 (инв. № 042652); бункер-накопитель /металлоконструкция/ (инв. № 042695); грохот СМД-107 (инв. № 042372); конвейер ленточный КЛ-РОЛ-5 (инв. № 041663); конвейер ленточный ТК-172 (инв. № 041655); три конвейера ТК-18 (инв. №№ 041532, 041533 и 041534); подогреватель жидкого теплоносителя (инв. № 042658); четыре цистерны 20 м³ (инв. №№ 020100, 020101, 020102 и 020103); комплектная трансформаторная подстанция КТП-250 (инв. № 040086); два резервуара стальных 60 и 50 м³ соответственно (инв. №№ 20097 и 593,3)
Сведения о земельных участках: кадастровый номер 423684000060000002, площадь – 0,5957 га; кадастровый номер 423684000060000003, площадь – 1,3591 га; 423684000060000004, площадь – 1,2704 га
Местонахождение – Гродненская область, Лидский район, Дубровенский с/с, 12, 14 в районе дер. Обманичи
Начальная цена – 3 340 008 342 белорусских рубля с учетом НДС
Сумма задатка – 330 000 000 белорусских рублей
Обременение – аренда
Предмет торгов №3
административно-бытовое здание общей площадью 966,8 кв. м (инвентарный номер 611/С-327), ремонтная мастерская общей площадью 2352,3 кв. м (инвентарный номер 611/С-328), проходная общей площадью 60,6 кв. м (инвентарный номер 611/С-332), гараж общей площадью 1078,6 кв. м (инвентарный номер 611/С-333), склад общей площадью 88,4 кв. м (инвентарный номер 611/С-331), канализационная насосная станция общей площадью 13,7 кв. м (инвентарный номер 611/С-330), станция пожаротушения общей площадью 35,0 кв. м (инвентарный номер 611/С-329), трансформаторная подстанция общей площадью 42,7 кв. м (инвентарный номер 611/С-334), пожарный резервуар (инвентарный номер 611/С-29951), наружные сети канализации (инвентарный номер 611/С-31344, адрес: г. Березино, пер. Промышленный), наружные водопроводные сети (инвентарный номер 611/С-31345, г. Березино, пер. Промышленный), вагон-дом (инв. № 016), вагон-общежитие (инв. № 0023), линия электропередач (инв. № 515), сеть электроснабжения (инв. № 0516) и 26 единиц оборудования: вулканизатор (инв. № 464), аппарат высокого давления (инв. № 1437), генератор EUROPOWER сварочный (инв. № 15), компрессор С-415М (инв. № 00442), пресс РХ-15 (инв. № 455), сварочный аппарат ТДМ-503 (инв. № 95), станок металлорежущий 2М-112 (инв. № 182), станок настольный сверлильный 2МШ2 (инв. № 00439), станок обдирочно-шлифовальный 2Н-1 (инв. № 196), станок отрезной ножовочный (инв. № 0438), станок радиально сверлильный (инв. № 00440), станок сверлильный (инв. № 177), станок токарно-винторезный, модель 161-БМ (инв. № 47), станок точильно-шлифовальный (инв. № 437), установка насосная высокого давления ЭСКО 15-20 (инв. № 48), электроталь (инв. № 505.1), три отопительных котла "МИР-95" (инв. № 010, инв. № 054, инв. № 062), электрогидравлический калун (инв. № 12), трансформатор ТМ-400/10 (инв. № 100), контейнер для хранения топлива (инв. № 223), подъемник ПТО-42 (инв. № 458), бойлер "Бренеран" (инв.№ 56), контейнернозаправочная станция (инв. № 476), трансформатор ЭК-250 (инв. № 106)
Площадь земельного участка – 2,0296 га, кадастровый номер 620450100001000276
Местонахождение – Минская область, Березинский район, г. Березино, пер. Промышленный, д. 6 (д. 6, корп. 1, д. 6, корп. 2, д. 6, корп. 3, д. 6, корп. 4, д. 6, корп. 5, д. 6, корп. 6, д. 6, корп. 7)
Начальная цена – 13 911 942 411 белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка – 1 000 000 000 белорусских рублей
Обременение – аренда

Продавец имущества – ОАО «Автомагистраль», ул. Кижеватова, 8, 220099, г. Минск, телефон (017) 212-50-62.

Организатор торгов – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов – победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Автомагистраль», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 не позднее окончания срока приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **04 ноября 2015 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.10.2015 по 02.11.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб.6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);
(017) 212-50-62 (ОАО «Автомагистраль»).

■ Факт

СПАРТЫЎНЫ ГАРАДОК СВАІМІ РУКАМІ

Міні-футбольнае поле і валейбольная пляцоўка з'явіліся нядаўна ва двары аднаго з самых маладых мікрараёнаў Шклова.

Ініцыятарамі выступіла раённае аб'яднанне прафсаюзаў. Да справы, якая праводзілася ў рамках акцыі «Мы — разам», далучыліся мясцовыя жыхары, моладзь, прадстаўнікі прадпрыемстваў горада.

— Гэтым мы хацелі паказаць, што ў Беларусі жывуць сумленныя людзі, якія разам ствараюць камфортныя ўмовы жыцця, могуць не на словах, а на справе зрабіць навакольную тэрыторыю больш прывабнай і функцыянальнай, — адзначыў **старшыня Шклоўскага раённага аб'яднання прафсаюзаў Аляксандр ПІМЕНАЎ.**

Тэрыторыя пляцоўкі для міні-футбола была ачышчана ад смецця і камянёў, зямля ўзарана і выраўнена, засеяна травой, зроблена разметка, усталяваны футбольныя вароты.

Не менш сіл пакладзена на добраўпарадкаванне валейбольнай пляцоўкі. Улічваючы, што летась тут была пабудавана хакейная пляцоўка, тэрыторыя стала падобна на сапраўдны спартыўны гарадок.

— Гэты раён сёння дынамічна расце і развіваецца, — адзначыў суразмоўца. — Тут жыве шмат маладых людзей, якія імкнуцца далучыцца да заняткаў спортам і здаровага ладу жыцця. Магчыма, праз гады хтосьці з гэтых хлопцаў парадуе нас сваёй гульнёй на чэмпіянаце Еўропы, а магчыма і свету.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

РЫЖЫК, «зорка» інтэрнэту

■ Жывая зямля

Дзікая норка па мянушцы Рыжык стала амаль ручной дзякуючы жыхару вёскі Хаценчыцы Вілейскага раёна Віктару Казлоўскаму. Дзесьці з месяц назад фатограф дзікай прыроды (яго здымкамі могуць любавацца чытачы часопіса «Родная прырода») заўважыў гэтага звярка недалёка ад свайго дома і стаў амаль штодня падкормліваць яго рыбай. Амерыканская норка (так вызначылі навукоўцы від маленькага драпежніка) так прызвычаілася да дармавых ласункаў, што, пачуўшы крокі «гаспадара», чакае яго на сцежцы і смела выхоплівае пачастунак з рук. А калі часам норка запозніцца на сняданак, Віктар два-тры разы пагукае Рыжыка, і звярок імгненна будзе тут як тут.

— Я хацеў прывабіць Рыжыка толькі для фотаздымак каля маленькай сажалкі, дзе ён жыве і палюе, і нават не падазраваў, што норка стане такой даверлівай, будзе садзіцца на калені і нават дазваляць сабе гладзіць, — кажа знаўца прыроды. — Думаю, што зносіны з чалавекам ніколькі не абмяжуюць яе волі.

Дзякуючы Віктару Казлоўскаму маленькі Рыжык паспеў стаць сапраўднай мадэллю для многіх беларускіх фатографаў і інтэрнэт-славутасцю, выклікаўшы ў сеціве шмат «лайкаў» і каментарыяў.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Дарагую **Аляўціну Валянцінаўну РАБЦАВУ**,
якая працуе паштальёнам у вёсцы Старое Сяло,
што на Міншчыне, шчыра віншуем
з днём народзінаў, з юбілеем!
Жадаем быць заўжды багатай —
Багатай шчасцем і спакоем,
Здароўем, радасцю ў сям'і,
Сябрамі вернымі, любоўю...
І ўсім прыгожым на зямлі!
Твае родныя і сябры.

■ Аншлаг

ХІТЫ АД «БЯСЕДЫ»

«Беларусь 3» завяршае рэспубліканскую акцыю

10 кастрычніка ў Мінску адбудзецца фінальны канцэрт шырокамаштабнай рэспубліканскай акцыі «Любіць Беларусь!» — у Палацы Рэспублікі прагучаць хіты, па якіх з лёгкасцю пазнаюць славуты ансамбль «Бяседа». Падчас брыфінгу, які зладзілі напярэдадні канцэрта, артысты і арганізатары змаглі падзяліцца сваімі ўражаннямі і высновамі аб патрабаваннях беларускай публікі і стаўленні да беларускай народнай песні.

Нагадаем, тэлеканал «Беларусь 3» разам з рэспубліканскім грамадскім аб'яднаннем «Белая Русь» і ансамблем «Бяседа» распачалі маштабную акцыю «Любіць Беларусь!» напрыканцы жніўня. За час творчай вандроўкі калектыў выступіў ва ўсіх абласцях краіны, дзе правёў 17 канцэртаў.

— У выніку гэтай акцыі мы яшчэ раз пераканаліся ў тым, наколькі ў нас прыгожая краіна, якія цікавыя тут людзі жывуць, якая прыгожая прырода і якія цудоўныя песні тут можна спяваць. Каля дзесяці тысяч кіламетраў праехалі артысты, і ўсюды іх цёпла прымала публіка. Канцэрты прайшлі з аншлагам. А для артыста, мабыць, самы важны паказчык прызнання яго творчасці, калі за яе «галасуюць» рублём, — сказаў **дырэктар Дырэкцыі тэлеканала «Беларусь 3» Віктар Маюны.** — Апошнім часам кантактуючы з работнікамі культуры, якія займаюцца арганізацыяй канцэртных выступленняў, часта чуў: «Як дрэнна ў нас ходзяць на канцэрты — вось, не можам прадаць білеты на Лепса...» А можа, не варта перажываць, калі на канцэрт ансамбля народнай музыкі квіткі разыходзяцца?

«Бяседа» аб'ехала з канцэртамі пяць абласцей. На працягу месяца калектыў дарыў добры настрой, іх чакалі ў кожным горадзе. Сустракалі гасцінна і запрашалі вяртацца з новымі выступленнямі.

— Акцыя стала для нас пацвярджаннем запатрабаванасці нашага калектыву, бо былі перапоўненыя залы, безліч кветак, інтэрв'ю і аўтографы, — падзяліўся ўражаннямі мастацкі кіраўнік ансамбля народнай музыкі «Бяседа» Леанід Захлеўны.

У сваю чаргу намеснік старшыні грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Аляксандр Шацько адзначыў: «Для нас гонар прадстаўляць гэты калектыў. Акцыя «Любіць Беларусь!» стала першай, але не апошняй, што датычыцца беларускай культуры.

Варта сказаць, што акцыя не заканчваецца канцэртам у Палацы Рэспублікі. Бо, напрыклад, на тэлеканале «Беларусь 3» будзе паказана праграма, прысвечаная ўсяму туру. Вандроўка з «Бяседай» у больш разгорнутым фармаце — расповед пра мясцовых людзей, краявіды і многае іншае.

Падарожнічала па краіне разам з ансамблем вядучая праграм «Размаўляем па-беларуску» і «Дыя@блог. Пра мову» на «Беларусь 3» Алена Трацэнка, якая ў межах акцыі ладзіла ў рэгіёнах віктарыны на веданне роднай мовы. Паводле яе слоў, «моўныя гульні» прыйшліся даспадобы публіцы: ахвотнікаў праявіць сябе было шмат, гледачы актыўна ўдзельнічалі ў віктарыне і атрымлівалі падарункі.

За навінамі акцыі «Любіць Беларусь!» будзем сачыць у спецыяльным цыкле «Вандроўка з Бяседай» на тэлеканале «Беларусь 3». Тыя, хто не змог убачыць той ці іншы выпуск спецпраекта, могуць пацікавіцца інфармацыяй пра акцыю на старонцы тэлеканала 3belarus.by, а таксама на афіцыйным сайце Белтэлерадыёкампаніі tvr.by.

Алена ДРАПКО.
drapko@zviazda.by

Даты | Падзеі | Людзі

10 КАСТРЫЧНІКА

1794 год — войскі паўстанцаў на чале з Тадэвушам Касцюшкам былі разбітыя каля мястэчка Мацаёвіцы на правым беразе Віслы. Сам Касцюшка быў цяжка паранены і ўзяты ў палон. Яго змясцілі ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Паўстанне ў ВКЛ і Польшчы з гэтага часу ўзначаліў генерал Тамаш Ваўжэцкі.

1861 год — нарадзіўся Фрыцьёф Нансен, нарвежскі падарожнік, акіянограф, грамадскі дзеяч, нобелеўскі лаўрэат. Ужо ў 20 гадоў ён прыняў удзел у плаванні па Паўночным Ледавітым акіяне на адным з судоў цюленепрамысловай кампаніі.

У 1883 годзе, пасля заканчэння ўніверсітэта, ён здзяйсняе падарожжа ў воды Грэнландыі на судне «Вікінг». Вярнуўшыся, Нансен ставіць перад сабой найцяжэйшую задачу — пераход праз усё ледзяное плато Грэнландыі ад яе ўсходняга берага да заходняга. Экспедыцыя адправілася ў шлях у 1888 годзе. Разам з пяццю таварышамі З кастрычніка 1888-га ён дасягнуў заходняга ўзбярэжжа, ажыццявіўшы першы пераход праз ільды Грэнландыі. Падчас усяго падарожжа Нансен і яго спадарожнікі вялі метэаралагічныя назіранні і збіралі навуковыя матэрыялы. Скончыўшы з аналізам атрыманых вынікаў, Фрыцьёф прыступіў да падрыхтоўкі яшчэ больш смелай і грандыёзнай экспедыцыі — да Паўночнага полюса. Нансену ўдалося дабрацца да Зямлі Франца-Іосіфа, дзе экспедыцыя зазімавала ў выбудаванай імі са шкур маржоў і камянёў зямлянцы. Улетку 1896-га туды прыбыла англійская экспедыцыя Джэксана, на судне якой даследчык і вярнуўся дадому, прабыўшы ў Арктыцы тры гады. Нансен напісаў шэраг прац, займаючыся адначасова грамадскай дзейнасцю. Ён быў паслом Нарвегіі ў Вялікабрытаніі, прадстаўніком Нарвегіі ў ЗША, у 1920-1921 гадах — вярхоўным камісарам Лігі нацый па справах рэпатрыяцыі ваеннапалонных з Расіі. У 1921 годзе па даручэнні Міжнароднага Чырвонага Крыжа стварыў камітэт «Дапамога Нансена» для выратавання галадаючых Паволжа. У 1922 годзе ён быў удастоены Нобелеўскай прэміі міру.

1939 год — у Маскве старшынёй СНК, наркамам замежных спраў СССР В. Молатавым і міністрам замежных спраў Літвы Ю. Урбшысам падпісаны савецка-літоўскі «Дагавор аб перадачы Літоўскай Рэспублікі горада Вільні і Віленскай вобласці і аб узаемадапамозе паміж Савецкім Саюзам і Літвой».

Было сказана

Ніна МАЦЯШ, паэтэса:
Без каранёў вялікіх не бываць
Вялікім дубу,
хоць з пароды й гэтай.

■ Ну і ну!

За паслугі таксі — сноўборд

У Мінску за крадзеж сноўбордаў быў затрыманы 29-гадовы жыхар сталіцы. Ён пайшоў на гэты крок, каб... расплаціцца з таксістам.

— Мужчына скарыстаўся паслугамі адной са сталічных службаў таксі. Паколькі паездка была працяглай, цалкам разлічыцца па лічыльніку кліент не мог і застаўся павінен таксісту каля 400 тысяч рублёў, — распавяла «Звяздзе» **прэс-афіцэр Савецкага РУУС г. Мінска Аляксандра Папова.** — Разжыцца грашыма мужчына вырашыў наступным чынам. У кватэры, якую ён здымаў, знаходзіліся два сноўборды, што належалі гаспадару жылля. Даўжнік і вырашыў іх прадаць. Скарыстаўшыся паслугамі ўсё таго ж таксіста і дамовіўшыся, што частка грошай ад продажу спартыўнага інвентару пойдзе на пакрыццё доўгу, зламыснік ездзіў з ім па горадзе ў пошуках пакупніка. Праз нейкі час кіроўца сказаў, што ў яго больш няма часу на паездкі і высадзіў пасажыра. Адзін са сноўбордаў застаўся ў машыне, а другі арандатар жылля прадаў свайму знаёмаму за адзін мільён рублёў. Цяпер «вынаходліваму» мужчыне пагражае пакаранне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Песню бярыце з сабою

БЕЛАРУСЬ — МАЯ МАЦІ

Гэта мусіць сказаць кожны з нас. Сказаць шчыра, праніклів, адчуўшы непадзельнасць свайго лёсу з гісторыяй роднага краю, з яго стваральным развіццём. Сказаць з гонарам за асабістую далучанасць да беларускай — святой — зямлі, сказаць з годнасцю, што ўсе яе слаўныя традыцыі будуць прадоўжаны, а велічныя справы памножаны намі.

Стваральнікі песні «Беларусь — мая маці» ўшанавалі гістарычны шлях нашай краіны, уславілі яе міраносную місію і магутную сілу славянскага духу. Ігар Лучанок і Анатоль Вялюгін выказалі сваё — мужнае, грамадзянска-патрыятычнае — прызнанне ў вернасці беларускаму народу. Іх творчасць даўно перасягнула межы Беларусі. А іх сумесную песню «Бярозка» выконвалі многія савецкія спевакі, уключалі ў рэпертуар і народныя артысты Расіі. Вакальны твор «Беларусь — мая маці» таксама шчыра гучаў на прасторах былога Саюза. Ансамбль «Сябры» з пяшчотнай урачыстасцю выносяць яго на сцэнічныя падмосткі замежных гарадоў і мястэчак. І заўсёды гэтая лірыка-патрыятычная песня ўспрымаецца як даверлівы расповед пра дзівосны беларускі край — яго гераічную гісторыю і прыроднае харства.

Верш Анатоля ВАЛЮГІНА
Музыка Ігара ЛУЧАНКА

На чырвоным шчыце
Столькі зорыцца
слаўных імён,
Не злічыць абеліскаў
Пад шызымі
крыламі хмар.
Мы з Крывіцкай Пагоні
Чытаем да сённяшніх дзён
Родных ніў і світанняў
Хвалюючы мудры буквар.

Прыпеў:
Беларусь — мая маці
і мова,
Паветра і хлеб!
Гэта зважана сэрцам
На нервах
расстайных дарог.
Гэта — роду прысяга,
Патрэба
штодзённых патрэб
І надзея надзей
У трывозе
адвечных трывог.

На памежжах у нас
Землі
верных суседзяў-братоў.
Абняла ты
Рукамі галін зарунелых
і рэк,
Залатымі вузламі
Карэнне аршанскіх дубоў
Так глыбока
З карэннем смаленскім
сплялося навек.

Прыпеў.

Чысты кужаль на золку
Бяліла ты ў белай расе,
А крывёй тваіх кроўных
Зара на тканіну цякла, —
І ты Сцяг узняла!
Сёння думку галубім усе:
Каб крывінка мая
У чырвонай палосцы
была!

Прыпеў.

Падрыхтаваў
Міхась ШАВЫРКІН.



ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

Рулеты з баклажан

Спатрэбіцца: *баклажаны — 3 шт., мясны фарш — 200 г, морква — 1 шт., часнок — 5 зуб., арэхі грэцкія — 0,5 шкл., зяленіва (кінза, пятрушка), хмелі-сунелі — 0,5 ч. л., маянэз, соль, алей.*

Баклажаны памыць, нарэзаць уздоўж на пласціны, пасаліць. Паставіць пад гнёт хвілін на 15-20, каб сышла горыч. Фарш абсмажыць на алеі. Моркву надзерці на дробнай тарцы і таксама абсмажыць. Арэхі дробна пасекчы або растаўчы. Змяшаць фарш, моркву, прапушчаны праз прэс часнок, арэхі, дробна насечанае зяленіва, хмелі-сунелі. Дабавіць маянэз, пасаліць, добра змяшаць.

Баклажаны адціснуць, абсмажыць на алеі. Абсушыць на сурвэтцы. Намазаць лустачкі баклажана атрыманай начынкай. Згарнуць рулецікамі.

ЧАСТУЙЦЕСЯ!

Віно з вінаграду

Самым простым з'яўляецца рэцэпт, для якога спатрэбіцца 10 кг нямытага, але ачышчанага ад смецця вінаграду і 3 кг цукру. Вінаград змяшчаюць у эмаліраванае вядро і старанна расціскаюць таўкачыкам.

Пасля выдзялення соку вядро накрываюць марляй і ставяць на 5 дзён для першаснага закісання ў цёплае месца. Неабходна штодня перамешваць вінаградны сок.

Калі жамерыны ўсплывуць на паверхню, сок працэджваюць праз марлю, а жамерыны добра адціскаюць. Атрыманы сок змешваюць з цукрам і выліваюць у шкляную бутлю альбо слоікі. На рыльцы ёмістасцяў надзяваюць прабітыя некалькі разоў іголкай гумовыя медыцынскія пальчаткі.

Цяпер засталося дачакацца фіналу закісання, які адбудзецца прыкладна праз месяц. Яго вызначаюць па здзьмутай пальчатцы. Віно разліваюць па бутэльках і пакідаюць на тыдзень для адстойвання. Затым зноў пераліваюць у новыя бутэлькі і пры гэтым сочаць, каб асадак застаўся ў старой. Гэтую працэдуру паўтараюць 3 разы, пасля чаго віно пакідаюць у спакоі яшчэ на паўтара месяца ў халаднаватым месцы. А потым можна атрымліваць асалоду ад самастойна выраблянага напою.

НА ЎСЕ РУКІ МАЙСТАР

Лаўкі ў садзе: і зручна, і прыгожа

Пагадзіцеся, цяжка ўявіць сабе сад, у якім няма ніводнай лаўкі. Гэта не проста гарызантальная плоскасць, на якую можна прысесці. Існуе вялікае мноства варыянтаў і мадыфікацый лавак. Але асноўныя законы яе размяшчэння аднолькавыя.

Лаўка павінна быць абаронена ад прамых сонечных прамянёў, асабліва апоўдні. Ажурная цень ад дрэў значна больш прыемная, чым цень, якую стварае сцяна дома. Па магчымасці, гэтае месца трэба абараніць і ад халоднага паўночнага ветру. Для гэтага падыдуць любыя варыянты «зялёнай сценкі». Чалавек адчувае сябе лепш, калі прастора ў яго за спінай не адкрытая. Таму лаўку можна паставіць каля сцяны дома ці пасадзіць за ёй высокія расліны. Прасторы перад лаўкай павінна быць дастаткова, каб змясціўся невялікі столік або дзіцячая каляска. Лаўкі можна ізаляваць ад астатняй прасторы саду, а можна, наадварот, усталяваць яе ў такім месцы, адкуль відаць самыя прыгожыя куткі.

Аптымальная вышыня лаўкі са спінкай — 40—50 см. У гэтым выпадку ногі зручна ўпіраюцца ў зямлю і адпачываюць. Шырыня сядзення — 50—55. Каб было зручна абапірацца, сядзенне трэба рабіць з невялікім (5-12 градусаў) нахілам унутр, а вугал нахілу спінкі павінен быць 15-40 градусаў. Вышыня яе — 35—45 см. Поручні, калі яны ёсць, мацуюцца на вышыні 15—20 см ад сядзення. Вышыня лаўкі без спінкі, як і яе шырыня, складае 40—50 см. Ну а даўжыня лавы можа быць якой заўгодна.

Даўжэй за ўсё служаць вулічныя лавы з натуральнага або прыроднага каменя. Але ў халодны час на камені доўга не пасядзіш. Таму такі матэрыял добра камбінаваць з дрэвам або іншымі «цёплымі» матэрыяламі. Вытанчаныя «карункі» каванай лаўкі падыдуць для рамантычнага саду, дзе прастора газона пераплятаецца з дрэвамі і кустамі, а кветнікі рознакаляровыя, свабодных формаў.

Калі хочаце зрабіць лаўку самі, выбірайце дрэва. Пры працы з ім варта ведаць некалькі сакрэтаў. Трэба выбраць дрэва, устойлівае да гніення: дуб, ляшчыну, вішню. Сядзенне і спінку лепш рабіць з дошчачак, тады вада падчас дажджу будзе прасочвацца ў шчыліны, і праз паўгадзіны пасля дажджу лаўка будзе сухая.

Ствараючы дызайн садовай мэблі, не абмяжоўвайцеся стандартамі. Частку ствала дрэва можна выкарыстоўваць як крэсла. Падвесьце на ланцугу бервяно — вось вам і лаўка-арэлі. А яшчэ можна выбраць зусім арыгінальнае рашэнне — стварыць лаву з грунту, пакрытага мяккай травой.

Извещение о проведении 10 ноября 2015 г. торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

Номер предмета торгов	1	2	3	4
Предмет торгов (наименование, характеристики)	Здание гаража, общ. площадь 801,5 м.кв. Износ 39,78%, год постройки – 1982. Фундамент железобетонный, стены кирпичные, перекрытия – железобетонные, кровля совмещенная рулонная. Кол-во этажей 1 (один)	Здание для хранения инструмента, общ. площадь 5,8 м.кв. Износ 58%, год постройки – 1983. Фундамент бетонный, монолитный, стены кирпичные, перекрытия железобетонные, кровля – рубероид. Кол-во этажей 1 (один)	Склад для дров, общ. площадь 30,5 м.кв. Износ 23%, год постройки – 2009. Фундамент бетонный, стены – блоки газосиликатные, кровля — шифер. Кол-во этажей 1 (один)	Здание проходной, общ. площадь 5,4 м.кв. Износ 22%, год постройки – 2008. Фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытия деревянные, кровля – шифер. Кол-во этажей 1 (один)
Местонахождение имущества	Минская обл., Молодечненский р-н, деревня Носилово, ул. Школьная, 30			
Начальная цена	1 953 400 000 рублей	12 400 000 рублей	33 600 000 рублей	23 000 000 рублей
Сумма задатка	195 340 000 рублей	1 240 000 рублей	3 360 000 рублей	2 300 000 рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10			
Балансодержатель (должник)	Открытое акционерное общество «Передвижная механизированная колонна № 32», Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2«Б»			

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Аукцион проводится **10 ноября 2015 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 13.10.2015 по 05.11.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 7.27	18.25	10.58
Віцебск	— 7.18	18.13	10.55
Магілёў	— 7.17	18.15	10.58
Гомель	— 7.12	18.14	11.02
Гродна	— 7.42	18.41	10.59
Брэст	— 7.41	18.43	11.02

Месяц

Маладзік 13 кастрычніка.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Дзмітрыя, Ігната, Марка, Пятра.*
К. *Марыны, Паўліны, Францішка.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+6..+8°С	КІЕЎ	+5..+7°С	РЫГА	+4..+6°С
ВІЛЬНЮС	+5..+7°С	МАСКВА	+1..+3°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+5..+7°С

УСМІХНЕМСЯ

У мяне жонка — мудрая жанчына! Нават калі мы з ёй пасварыліся і не размаўляем, мяне заўсёды чакае дома пасля працы вячэра: боршч, пельмені, кампот! Праўда, усё ў адной талерцы...

Муж:
— Дзе самарэзы?
Жонка:
— Калі ты пра кучаравыя цвікі, то ў шафцы.

— Моня, дарагі, перад вяселлем я хачу прызнацца-такі ва ўсіх сваіх грахах!

— Грахах?! Я цябе малю, ты ж прызналася тыдзень таму!

— Гэта — свежая інфармацыя.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.584. Індэкс 63850. Зак. № 4036.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 9 кастрычніка 2015 года.